# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №9 (37) (снежань)

www.litbel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: асноўныя падзеі літаратурна-грамадскага жыцця снежня ..... 2

«ПРЭЗЕНТАЦЫЯ»: уступ да вершаванай п'есы «АРМАГЕДОН» Уладзіміра НЯКЛЯЕВА ..... 3

«ПРОЗА»: Новыя абразкі Ніла ГІЛЕВІЧА з кнігі «Пераждыўшы вайну» ..... 4–5

«ПАЭЗІЯ»: ВЕРШЫ Эдуарда АКУЛІНА ..... 6

«ПРОЗА»: фрагмент «Пакутная веку» Васіля ЯКАВЕНКІ ..... 7

«ПАЭЗІЯ»: вершы ЗЬНІЧА, Алеся МАКРАЦОВА і Язэпа ПАЛУБЯТКІ ..... 8


## РОЗГАЛАС

**Сярод літаратурных тэм снежня, якія прыцягнулі ўвагу СМІ, стаў (калі не лічыць забароненых кніг) праект пад гучнай і таўталагічнай назвай «Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы» (СП СД), створаны ў Мінску 4 снежня. «Літаратурная Беларусь» таксама не магла абысці гэтую тэму, а паколькі напрыканцы месяца маем магчымасць зірнуць на яе «комплексна», прапануем своеасаблівы інфарм-дайджэст. Спадзяемся, што высновы з яго зробяць не толькі чыноўнікі, але і чытачы-падаткаплацельшчыкі…**

**БЕЛТА:**

«…на ўстаноўчым з'ездзе Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ў Мінску старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец і старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі Валерый Ганічаў абраныя сустаршынямі Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Дэлегаты ўстаноўчага з'езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы прынялі зварот да інтэлігенцыі і пісьменнікаў дзвюх краін. У звароце гаворыцца аб тым, што саюз ставіць сваёй мэтай прапаганду твораў класікі, залатога фонду літаратуры. Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы будзе спрыяць стварэнню ўмоў для развіцця новых талентаў у літаратуры...»

**NAVINY.BY:**

«Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) Алесь Пашкевіч паведаміў, што кіраўніцтва СБП не было запрошана на ўстаноўчы з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Рада і сакратарыят СБП нікога не дэлегавалі на гэты форум у якасці ўдзельнікаў або госцяў… А.Пашкевіч пажадаў поспеху ўдзельнікам з'езда. Разам з тым, ён выказаў упэўненасць, што правядзенне з'езда па стварэнні Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы з'яўляецца «чарговай прафанацыяй грамадска-літаратурнага жыцця», бо ў Расіі пяць пісьменніцкіх арганізацый, а ў Беларусі таксама іх не адна. «І калі ствараецца новая міжнародная пісьменніцкая структура, павінны калі не ўваходзіць, дык хоць бы згадвацца і запрашацца прадстаўнікі іншых літаратурных аб'яднанняў, у тым ліку Саюза пісьменнікаў Масквы, Саюза расійскіх пісьменнікаў, беларускага і расійскага ПЭН-цэнтраў», — адзначыў А.Пашкевіч.

Па яго словах, задачы і кірункі працы новай арганізацыі нічым не адрозніваюцца ад статутных палажэнняў даўно створанага правапераемніка Саюза пісьменнікаў СССР –Міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў (МСПС), якое да апошняга дня свайго жыцця ўзначальваў Сяргей Міхалкоў. «Стварыць саюзы стала ўжо модным, але галоўная задача пісьменніка — ствараць літаратуру, чаго ўсім і жадаю», — сказаў А.Пашкевіч».

**РАДЫЁ СВАБОДА:**

«…Мікалай Чаргінец не назваў гучных прозьвішчаў беларускіх пісьменьнікаў, якія запрошаны на ўстаноўчы зьезд…

Запрашаем мы ў залю жадаючых пісьменьнікаў, і таго Саюзу, і нашага».

**«НАРОДНАЯ ВОЛЯ»:**

«…Цікава, што ў новы саюз пісьменнікаў не ўвайшлі такія вядомыя майстры слова, як Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Алесь Жук, Анатоль Вярцінскі, Анатоль Кудравец, Сяргей Законнікаў, Віктар Казько, Валянціна Коўтун, Віктар Карамазаў, Васіль Зуёнак, Вольга Іпатава, Васіль Жуковіч...

«Народная Воля» пацікавілася ў знакамітых пісьменнікаў, чаму яны не ўвайшлі ў новы саюз.

**Рыгор БАРАДУЛІН:**

— Мяне туды не запрашалі, а нават калі б і запрасілі — не пайшоў бы. Я ўсё жыццё ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў і змяняць гэта не збіраюся. Думаю, як няма толку з гэтай Саюзнай дзяржавы, так і не будзе толку з гэтага саюза. Бо там, дзе пачынаецца зараблянне грошай, толку не бывае... Ды і што гэта за саюз? На яго ўстаноўчы з'езд ніхто з прыстойных і значных пісьменнікаў не прыехаў. Гэта проста кіраўнікі ствараюць новы саюз для сябе, а наіўныя людзі спадзяюцца на тое, што ім нешта перападзе.

**Генадзь БУРАЎКІН:**

— Не бачу сэнсу ўваходзіць у нейкі саюз неіснуючай дзяржавы. Гэта падзея не мае ніякіх адносін да развіцця літаратуры, узаемадзеяннеў беларускіх і расійскіх пісьменнікаў. Гэта ўсё палітычныя гульні вакол прывіднай ідэі вяртання Савецкага Саюза пад іншым соусам...

**Анатоль ВЯРЦІНСКІ:**

— …Чыстай вады палітыка... У сваім змаганні з сапраўдным, законным беларускім пісьменніцкім саюзам — сапраўдным і юрыдычна-прававым, і гістарычным, і ў нацыянальна-духоўным сэнсе — Мікалай Чаргінец прыводзіў, як правіла, адзін і той жа аргумент: маўляў, гэты саюз займаецца не столькі творчымі справамі, колькі палітыкай… Сыр-бор са стварэннем гэтага самага кроўна-брацкага пісьменніцкага саюза — чыстай вады палітыка. І, вядома ж, не самая добрая.

**Алесь ЖУК:**

— Здаецца, гэта гульні, амбіцыі, якія да літаратуры адносін не маюць. Шчыра кажучы, не надта я пра гэты саюз і іншыя калялітаратурныя пытанні думаю. Вось у Расіі пяць саюзаў, і што? Справа ж не ў колькасці, а ў тым, хто чым займаецца. Адно — праца на карысць літаратуры, іншае — калялітаратурная праца або праца на шкоду творчасці...

**Сяргей ЗАКОННІКАЎ:**

— …гэты новы саюз, напэўна, перахопіць эстафету ад праўладнага Саюза пісьменнікаў Беларусі — задавіць і выкінуць нармальны Саюз беларускіх пісьменнікаў, які жыве з 1934 года, быў заснаваны Купалам, Коласам, Гартным. Аднак гісторыю не парэжаш так проста — наш саюз як быў, так і будзе, нягледзячы на спробы ўсё адняць. СПБ дабіўся ўсяго, чаго хацеў: нават зараз арганізаваў кармушку больш маштабную, — акрамя аднаго — пісаць таленавіта. Бо тут не дапамогуць ніякія грошы і пасады.

**Віктар Казько:**

— Не ўспрымаю стварэнне яшчэ аднаго саюза сур'ёзна. Літаратура — справа глыбока нацыянальная. І творчы саюз павінен быць нацыянальным. Каб спатрэбіцца культурнаму свету, мы павінны згуртавацца ў адзіным нацыянальным саюзе… Лічу, у нас ідзе генацыд беларускай культуры, прыгожага пісьменства, сапраўднага мастацтва. Стварылі вось Грамадскі савет па маральнасці. Яго, дарэчы, узначаліў Чаргінец, які напісаў раман пра крывыя члены. А маю кнігу «Дзікае паляванне ліхалецця» ўзялі і выключылі з продажу ў дзяржаўных крамах. Хаця ў ёй ні пра якія члены не было...

**Валянціна Коўтун:**

— Некалькі дзесяцігоддзяў я з'яўляюся сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў, куды мяне прымалі яшчэ Панчанка, Мележ, Куляшоў. Іншыя саюзы ў мяне выклікаюць толькі пытанні... Пра стварэнне новага саюза я даведалася амаль выпадкова. Ну вось — з'явілася яшчэ адна паўжывая арганізацыя. Таму што ў творчых пытаннях галоўны аргумент — не юрыдычная даведка, а творчасць... Здаецца, акрамя вырашэння меркантыльных пытанняў для асобных людзей, ён нічога больш не зробіць. Не думаю, што гэты саюз унясе штосьці новае ў літаратуру ці палепшыць таленты. Талент даецца не саюзам, а Богам».



## НАВАГОДНЯЕ

**Васіль ЗУЁНАК**

*Як мала іх, тых вёснаў, на вяку,*
*Але ж, здаецца,*
*што не больш і зімаў…*
*Адыдзе год — і не падасць руку*
*Табе, свайму зямному*
*пабраціму.*

*І ўжо ніколі не сустрэцца вам…*
*За годам год на вечнае расстанне*
*Спяшаюцца — і ўжо ні тут,*
*ні там*
*Ты не пабачыш іх, як на экране.*

*Яны ўжо не твае, і ты для іх —*
*Як сцёрты знак у вечнасці*
*панылай…*
*Не верыцца аднак: няўжо хоць міг*
*Не вернецца з бясконцай*
*той магілы?..*

*Няўжо ўсё так: чужыя чужакі*
*Вы будзеце ад сёння назаўсёды…*
*І не пытайся: хто ты ёсць такі, —*
*Маўчаць, знікаюць дзесьці —*
*год за годам…*

## КАЛЯДНАЕ

**Валерыя КУСТАВА**

***Калі я быў маленькі, усе мае сябры наконадні Каляд пісалі лісты з пажаданням Дзеду Марозу ці Святому Міколу, я ж пісаў лісты Богу, бо лічыў, што Бог — самы галоўны Дзед Мароз, прэзідэнт усіх святых Мікалаеў.***
***Замест эпіграфа***

*Мэры Крыстмас! Глянь наўкола!*
*І прыдзі, святы Мікола,*
*снегам поўніць далягляды*
*на Каляды, на Каляды!..*

*Не праз сінія этэры,*
*а праз комін у кватэры.*
*Ды ў шкарпэткі пакладзі*
*дзівы — о-дзі-ры-дзі-дзі!*

*Як анёлак б'е ў курантны,*
*прамаўляю модлы-мантры:*
*дай нам, Звышні, на Каляды*
*шчасця ў горад наш праклятты.*

*Дай нам добрае надвор'е*
*без глабальных пацяпленняў.*
*Дай дзівоснае сузор'е,*
*дзе Венера з Марса млее.*

*Дай шалёных закаханняў*
*і каханых найшалёных,*
*каб у кожным у дыханні*
*любыя пачуць імёны.*

*Шчодры вечар. Шчыры вечар —*
*Добраму святому люду.*
*Словы простыя і рэчы*
*зіхацяць праднеснем цуду.*

*Калі быў зусім малечай,*
*я прасіў узяць на плечы*
*ў таты, мамы і ў дзядулі —*
*ды круціў з вышыняў дулі.*

*А цяпер прашу я ў Бога,*
*бо галоўны Ён Мікола,*
*каб пакутную дарогу*
*не разбіла часу кола.*

*Як раней прасіў я цацкі,*
*шчанюка і шмат цукерак,*
*так цяпер прашу я ласкі*
*боскай і людзей даверу.*

*Я раней дурнеў на святы,*
*у зімовай завірусе*
*кідаў ледзяшамі ў брата*
*і ў сумёт хавацца мусіў.*

*А цяпер гляджу я ў неба*
*кожнаю калядкай ноччу.*
*Падарункаў мне не трэба,*
*толькі б, Божа,*
*мне не збочыць…*

*На Каляды… На Каляды*
*Пахне цытрусавай елкай.*
*Ліхі ўсе і нашы звады*
*заліваем мы гарэлкай.*

*На Каляды… На Каляды*
*Беларусі роднай зычу*
*новай праўды, новай рады,*
*новага жывога клічу.*

*Новага-старога сцягу.*
*Новага-сівога гімна.*
*Каб на еўрапейскім шляху*
*ды не згінуць.*

*Каб зямля нам нарадзіла*
*Каліноўскіх і Скарынаў.*
*І каб не ўцякла радзіма*
*за кардон ці за адрыну.*

*На Каляды! На Каляды*
*Казкай поўніць далягляды.*
*Снегам поўніць туманы.*

*…А ўначы гучаць званы...*

СЕМІНАР

# ЛІТАРАТУРА — ДЗЕЦЯМ

**Саюз беларускіх пісьменнікаў правёў конкурс і агульнарэспубліканскі семінар па праблемах дзіцячай літаратуры.**

На конкурс было атрымана 69 твораў у розных жанрах: нізкі вершаў, кнігі вершаваных карацелек, слоўнік, паэтычныя зборнікі, вершаваныя п'есы, абразкі, апавяданні, аповесці, «генеральныя рэпетыцыі дзіцячых кніг», пераклады, інсцэніроўкі па беларускіх народных казках і інш. У конкурсе СБП прынялі ўдзел як прафесійныя літаратары, так і пачаткоўцы. Сярод іх — жыхары Мінска і бадай усіх абласных рэгіёнаў Беларусі: Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва…

Сакратарыят СБП правёў папярэдні адбор дзесяці лепшых твораў. Іх аўтарамі сталі:

Маргарыта Аляшкевіч, Марыя Баравік, Вера Бурлак, Алена Грункоўская, Васіль Жуковіч, Галіна Каржанеўская, Павел Ляхновіч, Міхась Міраноўіч, Аксана Спрынчан і Андрэй Хадановіч.

28–29 лістапада пад Мінскам у гасцінным будынку праваслаўнай епархіі Кінанія ў Калодзішчах адбыўся семінар па праблемах дзіцячай літаратуры, які ладзіў Саюз беларускіх пісьменнікаў. На семінар прыехалі ўдзельнікі конкурсу, літаратуразнаўцы, ілюстратары дзіцячай літаратуры і выдаўцы, а таксама госці са Швецыі, у тым ліку намеснік старшыні Саюза шведскіх пісьменнікаў Эва Сусо.



Фота «Ь»

За агульным сталом.



Выступае намеснік старшыні Саюза шведскіх пісьменнікаў Эва Сусо.

Падчас працы семінара былі падведзены вынікі конкурса на лепшы твор для дзяцей. Конкурс доўжыўся цягам года. Як адзначыў журналістам старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, «сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў выбраў 10 лепшых твораў. Дзесятку лаўрэатаў конкурса запрасілі на семінар. Майстар-класы праводзілі вядомыя беларускія аўтары дзіцячай літаратуры (Пятро Васючэнка, Людміла Рублеўская, Алена Масла і інш.), а таксама нашыя калегі са Швецыі (намеснік старшыні Саюза шведскіх пісьменнікаў Эва Сусо ды мастачка і дзіцячая пісьменніца Анна Хёглунд)».

Пераможцам конкурсу, на думку журы, стала паэтка Аксана Спрынчан (Мінск), другое месца прысуджана Маргарыце Аляшкевіч (Мінск), трэцяе — Паўлу Ляхновічу (Пінск). Ганаровая заахвочвальная прэмія за ўнёсак у развіццё дзіцячай літаратуры ўручана таксама вядомым творцам Галіне Каржанеўскай і Васілю Жуковічу.

26 снежня ў Мінску адбудзецца падобны семінар па праблемах літаратурнай крытыкі, які арганізавала і праводзіць рэдакцыя часопіса «Дзеяслоў» супольна з сакратарыятам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Н.К.**

РОЗГАЛАС

# ПЛЕНЭР У ПАЛАНЗЕ

**На пачатку верасня мне пашанцавала трапіць на незвычайны літаратурна-мастацкі пленэр. Толькі ўявіце: мора, сонца і цудоўная кампанія, якая суткі навылёт толькі і гаворыць пра паэзію. ІІІ-ці Міжнародны пленэр паэтаў і мастакоў, прысвечаны тысячагоддзю Літвы, сёлета прайшоў у Паланзе (у два папярэднія гады ладзіўся ў Нідзе і Друскеніках).**



Фота Сары Пуасон

Са старшынём Саюза літоўскіх пісьменнікаў Ёнасам Лінsocialistка

Беларускі паэтычны дэсант гэтым разам выявіўся найбольш маладым — у вясёлай кампаніі Андрэя Хадановіча, Глеба Лабадзенкі, Віталя Рыжкова і Насты Манцэвіч мне давялося трапіць у Вільню, дзе ў нас было колькі часу, каб агледзецца, прычакаць сваіх калег з Грузіі, Літвы і Украіны — і ўжо разам рушыць да Палангі, да Дому творчасці. Шукальнікі словаў і фарбаў цешыліся магчымасці (дадзеная Дэпартаментам развіцця супрацоўніцтва і падтрымкі дэмакратыі Міністэрства замежных спраў Літвы) бавіць час поруч пад гасцінным наглядам куратаркі праекту, вядомай літоўскай пісьменніцы і намесніцы старшыні Саюза літоўскіх пісьменнікаў Бірутэ Янушкайтэ. Удзень паэты збіралі перліны-словы на пляжы, сягаючы ў сваіх пошуках да самага далягляду, у якім мора рабілася небам. Мастакі ж выяўлялі на сваіх палотнах усё гэтае дзіва. А ўвечары ўсе разам збіраліся за сталамі на творчыя майстэрні — гутарылі, абмяркоўвалі, спраўджвалі паэтычныя нюансы з аўтарамі і натхняліся ажно да самае раніцы.

Фінальным акордам пленэру была паэтычна-музычная вечарына ў мясцовым клубе «Анапіліс», дзе ўвесь горад змог ацаніць тое, чаму быў прысвечаны цэлы тыдзень супрацы. Са сцэны гучалі арыгіналы вершаў у выкананні аўтараў, і, вядома, для прысутных палангаўцаў яны перакладаліся на літоўскую мову. А ў фае клуба адбылася выстава карцін мастакоў, прымеркаваная да заканчэння пленэру.

Вынікам творчых намаганняў сталася літаратурна-мастацкая анталогія «Вечары богавага дрэва», у якую трапілі творы ўсіх удзельнікаў пленэру ў перакладзе на літоўскую, беларускую, украінскую і грузінскую мовы. З беларускага боку кнігу аздобілі карціны Марыі Ісаёнак, Віталя Гуназы і Алены Пятроўскай. Прэзентацыя інтэрнэт-версіі альманаха адбылася ў лістападзе ў Вільні ў залі дома Саюза пісьменнікаў, дзе фарбы вершаў і карцін заззялі новым святлом. Як адзначыў у прадмове да анталогіі старшыня Саюза літоўскіх пісьменнікаў Ёнас Лінsocialistкас, «гэты пленэр дазволіў не толькі рассунуць далягляд літоўскай паэзіі, але і наноў вынайсці грузінскую філасофскую паэзію, параўнаць маладых беларускіх паэтаў з маладымі літоўскімі, а літоўскую лірыку — з украінскаю. У свае краіны госці вярталіся пасланцамі культуры Літвы, з думкамі і спадзяваннямі, што такія пленэры трэба ладзіць зноў і зноў — і ў Грузіі, і ў Беларусі, і ва Украіне, і ў Літве».

Няхай так і будзе!

Надоечы згаданая анталогія з'явілася на сайце Саюза літоўскіх пісьменнікаў, дзе кожны зможа азнаёміцца з яе зместам.

**Валерыя Кустава**

ЗАПРОСІНЫ

# СЛАВА ГЕРОЯМ!

Арганізацыйны камітэт украінскага фестывалю «Крыкнулі крывёю Круты» запрашае прыняць удзел у паэтычных чытаннях беларускіх творцаў.

Выступленні на літаратурна-акустычнай сцэне першага ва Украіне зімовага open air'у — гісторыка-патрыятычнага фестывалю — адбудуцца 29-30 студзеня 2010 года ў вёсцы Круты Ніжынскага раёна Чарнігаўскай вобласці, паблізу мемарыяла Героям Крут.

29 студзеня 1918 года — асаблівы дзень у гісторыі незалежнай Украіны. Гэта дата трагічнага бою пад Крутамі, у якім кепска ўзброеныя кіеўскія студэнты і гімназісты выступілі супраць расійска-бальшавіцкіх захопнікаў, адстойваючы волю Радзімы. Круты сталі сімвалам трагічнай долі ўкраінскай нацыі, сімвалам гонару і смутку.

«Але народ, які толькі аплаквае сваё мінулае, — гаворыцца ў прэсрэлізе аргкамітэта фестывалю, — не мае будучыні. Сярэднестатыстычны ўкраінец сёння нярэдка адмаўляецца лічыць палеглых юнакоў героямі, не разумее іхняй матывацыі».

Заклапочаная такой сітуацыяй ініцыятыўная група свядомай украінскай моладзі з падтрымкай шэрагу грамадскіх арганізацый («Малады народны рух», «Пласт», МНК, СУМ ва Украіне, Нацыянальны Альянс) вырашыла правесці першы ўсеўкраінскі гісторыка-патрыятычны фестываль «Крыкнулі крывёю Круты». Асноўная ідэя фестывалю палягае ў тым, што падзеі 29 студзеня 1918 года нельга разглядаць асобна ад гісторыі Украінскай Народнай Рэспублікі. Гэта была перамога рыцарскага духу.

Зыходзячы з гэтага, аргкамітэт фестывалю прапанаваў ушанаваць памяць герояў не плачам, а дэманстрацыяй неўміручай творчай сілы ўкраінскай нацыі. Удзельнікаў і гледачоў чакаюць канцэрты патрыятычных гуртоў і выканаўцаў, літаратурныя чытанні, тэатральныя выставы, кінапаказы, дыскусіі, семінары і інш.

Аргкамітэт фестывалю забяспечвае ўдзельнікам праезд, харчаванне і начоўку ў вагонах адмыслова зафрактаванага на час мерапрыемства цягніка.

Звязацца з арганізатарамі можна наўпрост па ўкраінскім нумары:

**8-10380678667141.**

# ЯПОНСКІ БЭСТСЭЛЕР ГОДА

**Новы двухтамовы раман Харукі Муракамі «IQ84» стаў сенсацыяй культурнага жыцця Японіі і прызнаны «бэстсэлерам года». Кніга выйшла на першае месца па колькасці надрукаваных асобнікаў: 3,23 мільёна.**

Раман выклікаў ажыятаж адразу пасля публікацыі — кнігу літаральна змяталі з прылаўкаў. Гэты першы мастацкі твор з 1990 года, які завяваў у Японіі статус «бэстсэлера года». Да гэтага на першае месца выходзілі разнастайныя займальныя даведнікі, мемуары, дакументальная літаратура. Сёлета раману Муракамі не нашмат саступіла кніга, якая распавядае аб цяжкачытэльных іерогліфах…

Па словах Муракамі, раман «IQ84» быў задуманы як свайго роду адказ на знакаміты «1984» Джорджа Оруэла. Гэтая кніга мае некалькі ліній, аднак у цэлым распавядае аб тым, як нейкая левая групоўка паступова ператвараецца ў секту вар'ятаў і забойцаў.

Растлумачваючы задуму рамана, пісьменнік у адным з інтэрв'ю сказаў, што некалі папулярны марксізм цяпер усё больш замяшчаецца фундаменталізмам і сектанцтвам. Кніга «IQ84», пераконвае літаратар, павінна паказаць людзям сучаснага свету, якія жывуць ва ўмовах глабальнага хаосу.

60-гадовы Харукі Муракамі, бясспрэчна, самы вядомы цяпер у свеце японскі пісьменнік. Амаль усе яго раманы станавіліся бэстсэлерамі: «Паляванне на авечак», «Нарвежскі лес», «Хронікі завадной птушкі», «Кафка на пляжы». Раманіст лічыцца таксама адным з верагодных кандыдатаў на атрыманне будучай Нобелеўскай прэміі па літаратуры.

**Паводле Newsru**



ПРАДМОВА

# БОГ НА ЗЯМЛІ НЕ ЖЫВЕ?..*

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

**Уступ да вершаванай п'есы «АРМАГЕДОН»**



Ёсць у мяне сябар, драматург, ён мне сказаў: «Ты ніколі не напішаш п'есу. Усе свае п'есы ты пражыў у жыцці».

Ён так і сказаў: «Пражыў у жыцці».

Раптам я адчуў, што не згодны з ім: не ўсе, не пражыў… І напісаў п'есу.

Магчыма, я напісаў не п'есу, не ведаю: раней я не займаўся драматургіяй. А калі й займаўся, дык выпадкова. Перакладаў, праўда. Шэкспіра, Лопэ дэ Вэгу, яшчэ некага… Таму ўсё ж будзем лічыць, што гэта п'еса. Вершаваная. А ў вершах галоўнае — тэмп і рытм.

Каб да гэтага болей не вяртацца, вы ўжо, калі ласка, запомніце: тэмп і рытм. Дакладныя паўзы. Моцныя і слабыя долі, іх чаргаванне. Тое, з чаго ўзнікае інтанацыя. То бок, тое, з чаго ўзнікае не толькі мастацтва, а ўсё: мора, маланка, птушка, жанчына. Як мінімум, у нашай свядомасці.

Я доўга думаў, пра што напісаць п'есу — і не прыдумаў, пра што… Таму напісаў пра ўсё, што можа стацца з чалавекам. І не толькі тады, пакуль чалавек жывы, але і тады, калі ён мёртвы.

З п'есы вынікае, што смерці не бывае. Хоць завяршаецца п'еса канцом свету.

Гэтая супярэчнасць і ёсць аснова быцця. На ёй і стаіць, хістаючыся, свет.

Яшчэ адна супярэчнасць — хоць не такая істотная: я не хацеў называць п'есу «Армагедон». Яна сама так назвалася.

П'еса гэтая не пра Захад і Ўсход, не пра габрэяў і славян, не пра палітыку, а ўжо тым больш не пра дыктатуру. Гэта так, драбяза… Чапляеш па паверхні — да і што бліжэй ляжыць. Але тое, што ў п'есе прысутнічае тэма вар'яцтва, ненармальнасці не толькі дыктатуры, але й любой улады, усялякага *гвалту* — так.

З п'есы вынікае, што той, хто згвалціў, забіў — не герой. Хто б яго ні называў героем.

Мне было гадоў дзесяць, калі я злавіў і забіў котку. Яна жыла ў свіране, бяздомная. Я забіў яе, узяўшы за заднія лапы — галавой аб бетонны слуп. Доўга, размахваючыся, я біў і біў каціным целам аб бетон, у коткі г а л а в ы ўжо не было, а я ўсё лупіў, лупіў і лупіў!..

Агрэсію, калі ўжо яна ўзнікае, немагчыма кантраляваць — і ў ёй ёсць асалода. Таму ніколі не будзе *апошняга* дыктатара, за апошнім абавязкова з'явіцца наступны.

Дамы з таварыства аховы жывёлін маюць поўнае права глядзець на мяне грэбліва. Можа быць, я хоць неяк перад імі апраўдаюся, калі паклянуся, што нікога, апроч той коткі, за ўсё сваё жыццё не загубіў. Апроч рыбіны, срабрыстай сёмгі, якую вылавіў я ў рацэ Умбе на Кольскай паўвыспе. Але ж лоўля рыбы — не забойства, не грэх... Рыбакамі былі двое апосталаў: Андрэй і Пётра. Ці нават чацвёра, калі ўлічыць Яна і Якава, *якія пачынялі сецi свае…* I Гасподзь карміў хлебам і рыбай.

Забіўшы котку, я адразу ж захварэў. Цяжка. Два тыдні па вачах доктара бачыў: ён думае, што я памру. Але я не памёр.

Маці малілася за ўратаванне маёй душы, а пасля, калі я ачуняў, павяла і мяне маліцца. Дзякаваць Богу за тое, што пакінуў мяне жывым.

Я спытаў папа, ці можна памаліцца за ўратаванне душы коткі?.. Поп сказаў, што нельга.

Чаму? У коткі няма душы?.. Але як мы можам пра тое ведаць?

Гэтая котка пераследуе мяне. Я спрабаваў забіць яе другім разам, у памяці — не выйшла. Я змусіў забіць яе аднаго з маіх літаратурных герояў — не дапамагло. Я ўспамінаю і ўспамінаю яе, пра яе думаю, яна мне сніцца. Прычым, кожнага разу сніцца розная: белая, чорная, рудая, у плямы — я не магу згадаць, якога тая, рэальная, забітая мной котка, была колеру? І такое адчуванне, нібы забіў я не адну, а дзесяткі, сотні, тысячы котак…

Начытаўшыся кніг па псіхалогіі, я разумею, адкуль яна — мая забітая котка. Але тое, што я гэта разумею, ніяк мяне не ратуе. І кожнага разу, калі я пазбаўляюся чарговай, белай ці чорнай, коткі, з жахам думаю: а калі б я чалавека забіў?.. Белага ці чорнага…

Я ўдзячны Богу за тое, што не паслаў Ён мяне на вайну, не стварыў варункаў, у якіх я мог бы — ці павінен быў бы — забіць. У дадзеным выпадку ў тым жа самым дзеяслове *забіць* зусім іншы — вы адчуваеце? — сэнс. Можа быць, *той коткай* Бог мяне ад *гэтага* перасцярог? Хаця наўрад ці, наўрад ці… Тут нешта іншае.

Калі вы бачыце… ну, скажам, у кіно, як галоўны герой, апантаны помстай, забівае, знішчае забойцу свайго брата, сваёй жонкі ці дзіцяці — вы пра што думаеце? Пра тое, што ён парушае закон? Як чалавечы, гэтак і боскі? І ў вас якое адчуванне? Жаху?.. Не. У вас адчуванне спраўджанай справядлівасці! І выклікане, народжанае яно ў душы вашай не Богам, не Богам…

У коткі няма душы — і Бог на зямлі не жыве?..

У дзяцінстве, ранкам прачнуўшыся, я амаль заўсёды знаходзіў свае чаравікі— кожны паасобку — у розных кутах. Дзед казаў: «З табой дамавік гуляе». Хоць ведаў, што звычка ў мяне такая: кідаць, кладучыся, чаравікі абы куды. І прыкмета аднекуль узялася: крочыць у адным чаравіку — скарачаць зямны шлях маці. Колькі крокаў ступіў — на столькі дзён скарацціў. Таму, абуўшы адзін чаравік, я скакаў да другога на адной назе, але колькі я на адной назе ні скакаў – маці ўсё адно памерла.

Мы не можам ніяк, нічога і нікога ўратаваць?..

Хіба нельга было ўзяць адзін чаравік і басаногім падысці да другога?.. Можна было. Але такое простае вырашэнне праблемы жыцця і смерці ніводнага разу не прыйшло мне ў галаву.

Найпрасцей мы ўскладняем — і ў тым таксама супярэчнасць.

Апроч сябра-драматурга, ёсць у мяне яшчэ адзін сябар, паэт. Мы з ім садзілі лес у Чарнобыльскай зоне, каб пыл не лятаў, каб зратаваць жывую, тую, якая побач, зямлю. Мы садзілі малады лес у працяг старога, з якога выскачыў аднойчы заяц-мутант — і перабег у лес малады. У яго не было двух галоў, не, але ён быў вялізны, сінебелы — і за ім цянуўся сіне-белы, нібы фасфарычныя, след…

Нельга, аказалася, працягнуць лес, не працягнуўшы тое, што ў ім. Усё адно ў адным.

Калі я пасадзіў маладую сасонку побач са старой, мне здалося, што старая нахілілася і пагладзіла яе.

Ноччу я падышоў да той векавой сасны… Стаяў і заклінаў яе падаць мне знак, што яна жывая, што можа абараніць, зратаваць.

Дрэва пагладзіла мяне па спіне. Я папрасіў, здранцвеўшы: «Яшчэ раз…» — і дрэва пагладзіла яшчэ раз. Я падумаў, што вецер, але ніжнія галіны сасны былі куды вышэй за маю галаву, куды вышэй…

З п'есы вынікае, што ў коткі ёсць душа — і дрэва не мёртвае.

У той жа аповесці, дзе я змусіў аднаго з персанажаў забіць котку, другі персанаж доўга яе даганяе, каб пагладзіць. Не забіць, не ўдарыць — пагладзіць…

П'еса пра банальнае: пра тое, што кожнаму хочацца, каб яго пагладзілі. Абаранілі, зратавалі. Але вельмі цяжка пра такое папрасіць: дранцвееш.

П'еса — пра няўтульнасць свету. Пра дысгармонію. Пра бессэнсоўнасць, якая не патрабуе сэнсу — і таму неверагодна складана сэнс знайсці.

У п'есе я не знайшоў яго — у выніку. Але ён бачыўся мне, калі я пісаў п'есу. Сэнс быў у тым, каб п'есу напісаць.

З п'есы вынікае, што сэнс жыцця ў тым, каб жыць. І не трэба баяцца гэтай банальнасці.

Я не толькі ў жыцці, але і ў літаратуры банальны. З усіх накірункаў мастацтва мне найбліжэй сентыменталізм, з усіх жанраў — меладрама. І абавязкова такая, каб быў happy end. Таму ў адным з варыянтаў п'есы я паспрабаваў прыдумаць happy end, вярнуўшы з таго свету на гэты памерлую дачку, Кацю, але яна не захацела вяртацца. І ў тым не мая віна. Гэта жывога можна змусіць зрабіць тое, чаго ён не хоча рабіць, а мёртвага — не.

Іншым разам я думаю, што добра быць мёртвым. Толькі неяк так хітра мёртвым: нібы мёртвым — нібы не. Каб насамрэч быць жывым.

У школе я быў закаханы ў дзяўчынку, у якой імя было падобнае на кветку. Яна жыла ў ваенным гарадку — і там, на стадыёне, знайшла з сяброўкай міну. Міну сцягнулі прапары з вайсковага склада — рыбу глушыць. І, п'яныя, згубілі. Міна была плоская і круглая, як дыск, сяброўкі сталі гуляць з ёй, качаць — і ўсё выбухнула.

Дык вось я ніяк тады не мог уцяміць, што тая дзяўчынка — мёртвая. Ведаць-то ведаў, але не разумеў. І цяпер не разумею.

А пра сяброўку яе і ведаў, і разумеў: мёртвая.

Як жа так?..

Непадалёку ад вайсковай часці, дзе стаялі ў шахтах нацэленыя на Амерыку ракеты, быў хутар. І пра шахты, і пра ракеты, і пра тое, куды яны нацэленыя, ведалі ўсе. І тым не менш — яшчэ адна супярэчнасць — гэта было найвялікшым дзяржаўным сакрэтам.

На хутары жыла ўдава Дурэйчыха з прыдуркаватай дачкой Зінай. Я меў бінокль — і глядзеў з лазняку каля рэчкі, як прыходзілі салдаты і гвалцілі Зіну. Яны давалі Зіне пернікі — і Зіна іх грызла; салдаты яе гвалцілі, а яна грызла пернікі.

Салдат, маладых, было многа, адной Зіны ім не хапала — і яны гвалцілі яшчэ й казу Дурэйчыхі. Калі ў казы здараўся перапынак, яна адыходзіла і пашчыпвала траву.

Зіна запівала пернікі казіным малаком. Яно сцякала з падбародка на грудзі, салдаты рабілі выгляд, нібы доюць Зіну — і смяяліся.

Потым прыходзіла Дурэйчыха, якой салдаты баяліся — і збягалі.

Чаму яны, салдаты, баяліся Дурэйчыхі?.. Яна была старая і нядужная.

Маім першым школьным настаўнікам быў габрэй з прозвішчам Цукерман. Ён не мог быць старым і нядужным, ягоны малодшы сын сядзеў са мной у школе за адной партай, але чамусьці запомніўся мне мой першы настаўнік старым і нядужным. Жонка ягоная са старэйшым сынам з'ехалі ў Ізраіль, дзе пачалася вайна, дзе старэйшага сына забралі ў армію — і на вайне забілі.

Як вы думаеце: што зрабіў мой настаўнік?.. Ён з малодшым сынам з'ехаў у Ізраіль, дзе зноў пачалася вайна, дзе малодшага сына забралі ў армію — і на вайне забілі.

Я праводзіў іх, калі яны з'язджалі… Рабіць гэтага было н е л ь г а, але малодшы сын Цукермана быў маім сябрам, і я спытаў яго, развітваючыся: «Ты хочаш, каб цябе забілі? За нешта чужое на чужой зямлі…» І сябар мой адказаў: «Так габрэям трэба…»

Можа быць, я не ведаю… Але чаму?

Калі я пісаў п'есу, дык, каб перадыхнуць, пераключыцца на нешта іншае, даволі шмат чытаў. І вось што вычытаў у Канфуцыя.

У яго, у Канфуцыя, нібыта спыталі:

«Ці можна дазнацца, што было раней за неба і зямлю?»

«Можна, — нібыта адказаў Канфуцый. — Раней было тое самае, што й цяпер».

П'есу (а дакладней: першы яе варыянт) пісаў я ў Фінляндыі, у Хельсінкі. Некаторыя сцэны напісаліся ў Стакгольме і на пароме. Паміж Хельсінкі і Стакгольмам — Батнічная затока, па якой ходзіць паром. Ён вельмі зручны, бо йдзе пераважна ўночы: спіш — і плывеш.

Мы спім і плывем.

У Стакгольме я спаткаў зямлячку: Рэню, Рэгіну… На пароме яна прыснілася мне медсястрой.

Калі Рэгіна сыходзіла, яна сказала ў дзвярах: «Не крыўдуй…» Нібы яна сыходзіць не таму, што я так хачу, а насуперак маёй волі. Тым самым яна змяніла не толькі фінал, а ўсю нашу гісторыю ад самага пачатку.

Вось што значыць сказаць нейкія словы якраз тады, калі іх трэба сказаць. Хай самыя банальныя, але ў час і ў найдапаведнай для іх сітуацыі… У жыцці гэта — мудрасць, у літаратуры — талент. Ці, калі заўгодна, прафесіяналізм. Майстэрства.

У мяне ёсць яшчэ адзін сябар-паэт, фінскі. І ў яго кепскі характар, праз які ад яго сыходзяць жанчыны, але ён упарты ў перакананні, што гэта ён сыходзіць ад іх, і кажа ў дзвярах: «Не крыўдуй…»

Бачыце: усё тое самае — і ўсё рознае. Хоць для сусвету, для неба і зямлі, для Канфуцыя не мае значэння, хто ў дзвярах — і што ён кажа.

Не цяжка заўважыць, што ў п'есе як бы некалькі магчымых фіналаў — і самыя нецярплівыя могуць прыйсці да аднаго з іх яшчэ ў першай дзеі. Тады можа атрымацца спектакль пра гаротнага бацьку. Калі ж трохі патрываць, працягнуць да сцэны ўваскрасення Дачкі, тады можа быць спектакль пра бацьку шчаслівага. Канешне, шчаслівага ў тым выпадку, калі Дачка зноў захоча ў гэтым свеце жыць.

Спектакль з такім фіналам маглі б паставіць амерыканцы.

Амерыканцы надта сентыментальныя, надта... Амаль як немцы.

Калі я пакідаў Фінляндыю, амерыканцы з немцамі запрашалі мяне жыць у іх, застацца назусім… Я казаў, што не магу назаўсёды пакінуць радзіму, бо там у мяне ўсе, каго люблю — і амерыканцы з немцамі мяне разумелі.

Самае дзіўнае ў свеце для мяне тое, што нехта некага яшчэ здольны разумець. Бадай, гэта найлепшае, што можа стацца паміж намі.

**П'еса «Армагедон» будзе друкавацца ў часопісе «Дзеяслоў».**

* Назва дадзеная рэдакцыяй «Ь».

АБРАЗКІ

# НОВЫЯ РАЗДЗЕЛЫ КНІГІ «ПЕРАЖЫЎШЫ ВАЙНУ»

Ніл ГІЛЕВІЧ



## Мама… Гэта — праўда?

Першы ваенны ліпень быў сонечны, сухі, гарачы, і хоць яшчэ не ўвабраўся ў палавіну — на ўзлесках пачалі ўжо чырванець суніцы і досыць смела вытыркацца з ягадніку спелыя чарнічкі. У жыцці пастушкоў — дзяцей і падлеткаў — гэта азначала: пара рабіць з лазовай кары кузаўкі і збіраць у іх божую смакату. А яна была для нас не толькі ласункам, але і сякім-такім «харчам», ва ўсякім разе хоць трохі спаталіць голад кузаўком ягад было можна.

Не помню, з-за чаго, але менавіта збіраючы ягады мы пасварыліся і нават пабіліся з Фэлькам Шпачком. Мы былі аднагодкі, але я быў трохі больш рослы, можа, і дужэйшы, і верх быў мой. Вось тады, пад крыўду і злосць, Фэлька і выпаліў мне:

— Пачакай, пачакай, будзе табе не такое! Твой бацька камуніст — і немцы вас усіх заб'юць, усю вашу сям'ю!..

Пагроза была такая нечаканая і страшная, што я спачатку нават разгубіўся. Звычайна мы, сябрукі, у такіх выпадках па слова ў кішэнь не лезлі і давалі адказ адпаведне. А тут — як бы нават і мову мне на колькі секунд адняло. Я ведаў, што наш бацька камуніст і што нямецкія фашысты — ворагі савецкай улады і камунізму, але… але… Але ж таты няма, яго ж забралі ў армію, ужо на другі дзень вайны. Гэта я і сказаў Шпачку — зусім не задзірыстым, амаль ціхім голасам:

— Дык жа наш тата на вайне…

Шпачок, відаць, адчуў, што «заехаў не туды», зачапіў тое, што казаць няможна, вялікі грэх, — вінавата замаўчаў і падаўся ад мяне прэч.

Па захадзе сонца, прывёўшы з пасьбы Недзяленю, усё яшчэ ўражаны тым, што пракрычаў мне Фэлька, я падышоў да мамы і няголасна, з перадыханнем, спытаў:

— Мама… гэта — праўда?

— Што — праўда? — заўважыла мама мой якісь нязвыкла заклапочаны пагляд.

— Што немцы… нас заб'юць, усю нашу сям'ю?..

Мама, вядома ж, зразумела, што я гэта ад некага пачуў — і таму пытаюся, ці праўда.

— Табе нехта сказаў?

— Шпачок сказаў… Там, у полі…

— Дурны твой Шпачок — дык дурное і гаворыць, — цяжкім апалым голасам прагаварыла мама. — Не думай, сынку, пра гэта, не думай…

Назаўтра апаўдні прыйшла з Айнаравіч праведаць нас цётка Ганна, маладзейшая маміна сястра, і я міжволі пачуў, як мама, горка ўсхліпваючы, пераказвае ёй маю размову з Фэлькам. Пачуў і новае: аказваецца, мама хадзіла ўчора вечарам да бацькоў Шпачка. «Хадзіла, Ганначка, заплакала там і спытала ў Еўкі — Петруся дома не было: «Што мы вам кепскае зрабілі — ці я, ці мой Сымон, ці мае дзеці? Чаму ж Ваш Фэлька радуецца?» Еўка запэўнівала мяне, што гэта ён недзе пачуў, што дома, у іх сям'і, ён не мог пачуць такое…»

Прыходзіла, ці не ў той жа дзень, і цётка Паўліна з Пасёлку, старэйшая бацькава сястра. У тыя дні нашы блізкія родныя перажывалі за нас, за жонку камуніста Кацярыну з дзецьмі, бо пачалі хадзіць надта страшныя чуткі… Думаю, што гэта цётка Паўліна, сама жанчына набожная, настрашыла маму і пераканала, што трэба неадкладна везці ў Лагойск і пахрысціць у царкве дзяцей. Бо гэта ж не жартачкі! Мала таго, што дзеці камуніста, дык яшчэ і ўсе да аднаго нехрышчоныя! Поўная хата нехрысцяў!

У бліжэйшую нядзелю мамін стрыечны брат Ліксандар Давідовіч узяў у яшчэ не распушчаным калгасе падводу, і мы паехалі ў Лагойск на хрышчэнне. На возе — мама з чатырохмесячным Алесікам на руках, двухгадовы Марацік, пяцігадовыя Света і Коля, нашы двайняты, і сямігадовая Ідзея; старэйшыя — Ліна, Леўка і я — за возам, пешкам; ну, дзе з гары — і мы падсаджваліся. У Лагойску, а было ўжо пад абед, нам не пашанцавала: царква зачынена, поп пайшоў да некага з лагайчан на хрэсьбіны. Дзядзька Ліксандар загнаў падводу на цяністы царкоўны двор і падаўся ў мястэчка шукаць святара. Праседзелі мы там бадай што гадзіны дзве, а то і з гакам. Відаць, папу на хрэсьбінах было добра і ён пакідаць застолле не спяшаўся, хоць ведаў, што хрысціць дзяцей не прыязджаюць з пустымі рукамі. Нарэшце, дзядзька прывёў яго, менавіта прывёў, бо падмога была патрэбна, гэта нават мы, старэйшыя дзеці, заўважылі. Тым не менш хрышчэнне адбылося. У царкве, на загад папа, мы сталі ўсе цесненька ў шэраг, мама называла па чарзе імёны, і поп, перайначваючы на свой лад тыя, якія ён у «святцах» не сустракаў, апырскваў кожнага з нас свянцонай вадою. Алесіка апырскаў на руках у мамы.

Будучы ўжо дарослым, я пачуў аднойчы дасціпную прымаўку, сказаную ў адрас чалавека пэўнай, зусім не лепшай натуры: «Яго, відаць, п'яны поп хрысціў». Пачуў — і сам сабе моўчкі ўсміхнуўся: у дачыненні да мяне — дык гэта цалкам адпавядае рэчаіснасці.

## У бабскую змену

Незадоўга да вайны, можа, усяго за год, у нашай Слабадзе збудавалі лазню — для ўсіх жыхароў вёскі, калгасную. Тыпавую, на тры аддзяленні (дзе раздзяваюцца, дзе мыюцца і дзе парацца), з дабротнай падлогай у раздзявальні і гладкім цэментаваным долам у мыйніцы і парыльні. Пару здабывалі як і ў дапатопных прыватных лазеньках-восецях — чабэхалі ваду на гарачыя, да чырвана распаленыя камяні. Адкрыццё калгаснай, то-бок грамадскай лазні было фактам актыўнага наступу сацыялістычнай культуры (кажу без іроніі) на заскарузлы і заімшэлы побыт старое вёскі. Новую лазню вяскоўцы вельмі ўпадабалі і нямала ганарыліся, бо яна была на ўсё наваколле адна-адзіная. Зазначу, між іншым, што і падчас нямецкай акупацыі, прынамсі першыя два гады, па дамоўленасці між сабой жыхароў вёскі, лазня працягвала спраўна функцыянаваць (пардон за надта паэтычнае слоўца!) і такім чынам па-ранейшаму стаяць на варце здароўя.

Натуральна, як толькі пакаціўся на захад, у бок Нямеччыны, фронт, і трэба было брацца за наладкаванне мірнага жыцця, слабодцы (цяпер, пададукаваўшыся і падкультурыўшыся, пішуць «слабадчане») успомнілі і пра лазню. Ды і як было не ўспомніць — пасля доўгіх месяцаў бадзяння па лясах і балотах, жыцця ў зямлянках і буданах, у запанібрацтве з блохамі, вошамі і каростай (цьфу, брыдота!). Мужчын у Слабадзе было тады — ну колькі? — шэсць ці сем старых дзядоў, хворы Анцік, хворы Кароль ды старшыня калгаса Банук. І ўсё! Усе астатнія пайшлі вызваляць Еўропу ад фашызму. Было яшчэ некалькі хлопцаў-прызыўнікоў, сямнаццацігадовых, — яны пойдуць на службу ў верасні; і былі «пашавэлкі», мальцы-падлеткі. Пашавэлкі, але ж мужчыны, і на работу ўжо ішлі на мужчынскую, тым лікам і ў лазню — напаліць камення і нагрэць вялізную кадзь вады. І вось — упершыню пасля няволі слабодская калгасная лазня гатова прыняць закарэлых, занудзелых, запаршывелых людцоў. Як і заўсёды раней, гатоўнасць гэтая аб'яўлялася на час падвячоркавы, на позняе паслябеддзе. І па ўсталяванай завядзёнцы, у першую змену мыліся мужчыны, у другую — жанчыны. Усё добра, але — як быць са мною? Я — пастушок у сям'і, я павінен на абедзе і аж да захаду сонца быць у полі, пасвіць Недзяленю. І мама рашыла так:

— Прыйдзеш, як памыюцца апошнія бабы… Я цябе пачакаю ў раздзявальні. Вады гарачай яшчэ будзе, яна заўсёды астаецца. І я табе памагу — адшару спіну, а галоўнае — вымыю галаву, бо яна ўжо ўся брудам зарасла.

Не надта мне гэта спадабалася: мыцца ў канцы «бабскай змены», але — нічога не зробіш, давядзецца падпарадкавацца абставінам; вайна прывучала нас да гэтага амаль кожны дзень.

Ужо апусцілася за цёмнае кустоўе на далёкіх пагорках сонца, калі я, завёўшы на падворак Недзяленю, пабег у лазню. У раздзявальні, як і дамовіліся, мяне чакала мама — распараная, з мокрымі распушчанымі валасамі, у зрэбнай споднай сарочцы, — такая памаладзелая, прыгожая… Больш у прылазніку ўжо нікога не было…

— Во малайчына, — пахваліла мяне мама, — хадзі за мной, там распранешся, на лаўцы. Вады гарачай і ў вядро і ў таз я набрала, дык мы хуценька…

Так, ласкава і любасна, прыгаворваючы, мама пайшла паперадзе мяне ў мыйніцу. Быў я ўжо не малое хлапчанё, але разумеў, што для маці — я дзіця і што саромецца яе мне не трэба. Я хуценька сцягнуў праз галаву кашулю, скінуў порткі разам са споднікамі, паклаў усё на лаўку, падышоў да таза, напоўненага да краёў вадою, і прысеў на «кукішкі». Таз стаяў пасярод мыйніцы, насупраць вакна; тут яшчэ было досыць відна, бо па кутах ужо згусцілася сутонне, — як казала калісьці нам, малым, бабуля — там ужо «хаваюцца дзяды». Не паспеў я акунуць у ваду далоні, як… пачуў жаночыя галасы! У шчыльна зачыненай парыльні гучна перамаўляліся жанчыны!

— Мама! Там жа гавораць! Там нехта ёсць!..

Я так спалохаўся, што хацеў кінуцца да адзення і нацягнуць на сябе порткі.

— А гэта там яшчэ Стэпка з Міхалінай, пазней за ўсіх прыйшлі, дык і забавіліся, — спакойна патлумачыла мама, — так спакойна, як быццам там не Стэпка з Міхалінай, а Сцяпан з Міхалкам. — Пакуль яны там адхвошчаца, дык ты і будзеш гатоў. Давай, нагінай галаву над тазам, і пачнём…

Але не паспеў я нахіліцца і зачэрпнуць прыгаршчамі вады, як скрыпнулі дзверы і з парыльні выскачыла, з бляшаным тазікам у руцэ… голая Стэпка — маладая, дваццаціпяцігадовая маці траіх байстручкоў (першага нарадзіла ў сямнаццаць).

— Вой, адхвасталася! — выгукнула, шумна выдыхнуўшы з сябе паветра, Стэпка.

І тут убачыла чорт ведае што: мужчына на яе глядзіць зусім зблізку! Яна стаяла да дзвярэй спіною, а тварам — на сярэдзіну мыйніцы, на святло з вакна. Імгненна мяне абдало хваляй сораму, і я пачаў плёхаць на валасы вадою. Апошняе, што заўважыў, гэта — як яна машынальна засланіла тазікам ніжнюю палову жывата.

— Вой, Кацярынка, гэта ж ты хлапца прывяла сюды! Здурнела, далібог! Ён жа ўжо вялікі!

— А бо-о-о, Стэпачка! — намыльваючы мне галаву, заапраўдвалася ў адказ мама. — Трэба яму на цябе глядзець! Рабі сваё і толькі…

Зноў скрыпнулі дзверы, і, не падымаючы галаву, я зразумеў, што Стэпка вярнулася назад, у парыльню. Ну так, адтуль зноў пачуліся галасы. Нягучныя, прыглушаныя.

Мы завяршылі справу амаль моўчкі. Мама добра, не шкадуючы мыла, вымыла мне галаву, старанна адшаравала мачалкай плечы, спіну, грудзі…

— Ногі харашэнька вымый сам, — сказала. — Усюды, і пад каленямі, і вышэй…

Да канфузу, які толькі што адбыўся, яна не вярнулася ні словам; напэўна, палічыла, што невялікае саромнае здарэнне гэтым і вычарпана. Хоць, думаю, адчула — па маім маўчанні — што з'яўленне «несвятой Стэфаніды» зрабіла на мяне вельмі моцнае ўражанне. І напэўна ўпершыню зразумела, што яе сын-пастушок ужо сапраўды, як сказала Стэпка, вялікі.

## І цяпер чую той глухі трэск…

У першыя ж месяцы па вызваленні ў нас на Лагойшчыне запанавала спакойнае мірнае жыццё. Кажу: у нас, бо ў раёнах былой Заходняй Беларусі яно яшчэ мірным не было — там яшчэ хаваліся па лясах узброеныя людзі, якія рабілі напады на дзяржаўных службоўцаў, на міліцыянтаў, на прыезжых з усходу настаўнікаў, і гучалі стрэлы, і лілася кроў, і сіраціліся дзеці. У нашым баку нічога такога, дзякаваць Богу, чуваць не было. І па нашых лясах мы ўжо хадзілі спакойна, калі і баяліся — дык толькі адзіночных нямецкіх аўчарак, якія засталіся тут без гаспадароў і, былі выпадкі, хапалі і загрызалі малых дзяцей.

Калі пайшлі першыя ў нашым Баранаўскім лесе грыбы — ніякія чуткі мяне стрымаць не маглі. І я, ці адзін, ці на пару з якім дружбаком, накіроўваўся, як модна цяпер казаць, на «ціхае паляванне». Аднойчы, ужо дзесьці ў верасні, збіраючы апенькі, я знайшоў пад высознай ялінаю цёмна-шэрую, з тонкага сукна, коўдру. Нямала ўзрадаваўшыся, прынёс знаходку дадому і ўручыў маме. Мама паглядзела, абмацала харашэнька знаходку і радасць маю адчувальна астудзіла: коўдра, бачна, доўга ляжала там, дзе я знайшоў яе, — значыць, і пад дажджом, і, намоклая, на сырой зямлі, і не сушылася на сонцы. А гэта ў сваю чаргу значыла, што дабрэннае тонкае сукно здорава падспарахнела, страціла былую моц і трываласць. На шчасце, не настолькі, каб зусім разлазіцца-распаўзацца, як усякая гніліна. А яшчэ мама зрабіла адну выснову, якую з пэўнасцю пацвердзіў і дзядзька Ліксандар: коўдра гэта нямецкая, яе пакінулі тыя ваякі, што трапілі ў «Мінскі кацёл» і выходзілі з акружэння, прасочваліся групкамі на захад. Хтосьці з іх і расстаўся ў нашым лесе з казённым дабром.

Пэўны час коўдра служыла па назначэнні, а пасля, здаецца, гэта было ўжо зімой, мама, у пошуках выйсця, чым бы прыадзець хоць аднаго са сваіх «абарванцаў», пашыла з яе мне порткі. Дабрэнныя, я нават сказаў бы — шыкоўныя, і на выраст, порткі. У іх я і пачаў «шчыгіляць» — і дома, і на людзях, паколькі іншых, на змену, не было. Так «дашчыгіляў» і да жніўня наступнага, сорак пятага года. А ў тым памятным жніўні… Пра гэта і пойдзе аповед.

У жніўні па ўсёй Беларусі малацілі збажыну, натуральна, і ў нашым калгасе «Іскра» (назва засталася даваенная). А хто малаціў, каму было малаціць? І якою агратэхнікай карысталіся? Мужчын у вёсцы — менш чым пальцаў на адной руцэ. Жалі жытцо бабы-жнейкі сярпамі, як і дзвесце гадоў назад. Баб было шмат, за вайну не ўбавілася. А мужчын… У мужчыны пайшлі шаснаццаці- і чатырнаццацігадовыя падлеткі — іншага выйсця не было. Мы, падлеткі, і звезлі на калгаснае гумно ўсё тое, што нажалі жнеі. Мы і памагалі ўсё тое абмалаціць. А трэба ж было вельмі-вельмі спяшацца! Па вёсках ездзілі «ўпаўнаважаныя» і падганялі хутчэй выканаць

— як тады пісалася ў газетах і на плакатах — «першую запаведзь»: своечасова (а лепш і трохі раней) «разлічыцца з дзяржавай», здаць хлеб у дзяржаўныя засекі.

Дык вось, малацілі мы ў тым жніўні, як і да вайны было, малатарняй на конным прыводзе. Сёньняшнім «працаўнікам аграрнага сектару» і ўявіць цяжка, што гэта такое — конны прывод. А гэта зусім не складаны механізм з прыстасаваннем для перадачы конскай сілы ў малатарню, каб прывесці ў рух барабан, які вымалачвае з каласоў зерне. Два кані, ходзячы адзін за адным па крузе, круцілі кола, ад якога, пры дапамозе адмысловага «кулака», да малатарні ішоў, круцячыся, доўгі і нятоўсты металёвы вал. Коней трэба было, вядома ж, паганяць — і менавіта гэты абавязак клаўся на падлеткаў. На галоўную справу каля малатарні ставілася двое дарослых: жанчына кладзе сноп на «стол» і разразае перавясла, а мужчына падае той сноп у малатарню, добра яго растрыбушыўшы і распластаўшы, бо яна можа папярхнуцца і не праглынуць.

У той жнівеньскі адпаўднёвік адным з паганятых на крузе быў я. Работка, калі па шчырасці, досыць сумная, нецікавая. Хаджу і хаджу па крузе, нібы і сам упрэжаны, і адно зрэдку варухну лейчыной, калі падасца, што конь «дае сабе паслабку». Ну і пры гэтым нешта скажу Гнядому, прыкрыкну. Гудзе малатарня, жанчыны, падносячы да «стала» снапы, нешта гукаюць і смяюцца, відаць, жартуюць. А ты — хадзі і думай сваё, ці мала што, калі табе чатырнаццаць, лезе ў галаву. Хаджу і думаю. Хаджу і думаю… І раптам… нейкая страшная сіла пацягнула з мяне левую штаніну, а паколькі яна не сцягваецца, бо порткі падперазаны вельмі моцна, — пацягнула і нагу, пацягнула пад металёвы вал, які круціцца. Усё вырашылася за нейкія долі секунды. Я з жахам адчуў, як маю ступню падбірае пад сябе жалеза, і страшна закрычаў, і колькі сілы — упёрся нагамі ў дол і ўсім целам тузануўся назад… І пачуў кароткі глухі трэск, і адчуў, што нагу з-пад рухомага жалеза выхапіў. З болем — але выхапіў. Зірнуў долу — на тоўсты металёвы «кулак» намотваецца мая штаніна. Гэта яна і трэснула, секунду назад, вышэй калена. Па тэхніцы бяспекі «кулак» павінны былі накрыць бляшаным ці драўляным каўпаком, але гэтага не зрабілі. Пачуўшы мой крык, напарнік спыніў свайго каня; спыніўся і мой; спыніўся прывод; перастала гуркатаць малатарня. Жанкі, а ўслед і мужчыны, кінуліся да мяне. Убачылі мяне з адной штаніной — і ўсё зразумелі, і жахнуліся.

— А дзіцятка маё! А ці хоць цэлая нага, пакажы! Там сочыцца кроў, па-над пальцамі…

Я маўчаў, збялелы, мова яшчэ да мяне не вярнулася. Адна з жанок нахілілася і пачала ціскаць і паварочваць у бакі маю ступню.

— Моцна баліць?

— Не, не моцна, толькі тут зверху, дзе кроў… Але не моцна.

— Дзе кроў — гэта счасала жалезам скуру, гэта не страшна. Галоўнае — каб пералому не было… Наступі моцна гэтай нагою на зямлю. Не баліць?

— Не, не баліць…

— Ну, то тваё шчасце, дзіцятка. Ідзі дадому — хай пабачыць і парадуецца маці, які ты шчаслівец у Бога.

Дадому я пайшоў загуменнем. Ну не ісці ж з голай аж да сцягна нагою па вуліцы.

Мама, здаецца, усё зразумела раней, чым я ёй расказаў. Таксама пацісkала, пакруціла ў пальцах маю абчасаную да крыві ступню і праслязілася. І сказала дакладна, як тая жанчына:

— Шчаслівец ты ў Бога, сынок. Калі б тая коўдра была не падапрэлая, не падгнілая — трэснула б нага, а не штаніна.

Іншы раз прыгадаецца той далёкі жнівень — і, здаецца, я зноў чую кароткі глухі трэск суконнай палатніны.

## «А што гэта ты па-дзеравенску гаворыш?»

Як у першыя пасляваенныя гады горад, з дазволу дзяржавы, вычышчаў з беларускай вёскі моладзь — страшна ўспомніць!

Божа, што рабілася!

Навыперадкі, адзін перад адным, беглі, уцякалі з вёскі хлопцы і дзяўчаты, тым лікам і яшчэ зусім зялёныя падлеткі. Уцякалі ад голаду і галечы, ад убоства і забітасці, ад беспрасветнай нэндзы. Колькі было, у тым ліку ва сорак шостым, што ад хранічнага недаяду пухлі і паміралі дзеці, або станавіліся рахітыкамі. Доўгімі зімовымі вечарамі школьнікі, слепячы вочы, рабілі ўрокі пры газовачках — іх яшчэ называлі «смаркачыкамі». Да электрыкі было яшчэ далёа-далёка. Нават да радыёвяшчання — самага элементарнага, праваднога — яшчэ не дайшлі, слухалі — калі дзе быў адзін на ўвесь сельсавет — прыймач на батарэях…

За пяць гадоў (1946 — 1951) у маёй Слабадзе амаль не засталося маладых людзей — нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат. З'ехалі ў горад, пераважна ў Мінск. Не на вучобу, не. З'язджалі, каб уладкавацца ў горадзе на любую работу, пераважна на будоўлю і ў домработніцы, у нянькі. У тыя гады я часта з імі, сваімі землякамі-равеснікамі, сустракаўся — або ў Мінску, або, часцей, па дарозе дадому ці з дому. На выхадныя і на святы яны ехалі да бацькоў, у родны куток, са зразумелым настроем, які падаграваўся не толькі прадчуваннем радасці ад сустрэчы з блізкімі-роднымі, але і амбіцыйным разлікам засведчыць у вёсцы, што я — выйшаў (ці выйшла) у людзі, я — гараджанін (ці гараджанка), я жыву ў сталіцы, дзе і кіно, і тэатр, і трамвай бегае па вуліцах. Праўда, у тэатры яшчэ ні разу пабыць не давялося, і ў кіно сходзіць амаль зусім не выпадае, але… хто пра гэта ведае? Усе ведаюць, — і гэта галоўнае, — што ў Мінску ёсць і кіно, і тэатр, і марожанае прадаецца на вуліцах… Гэта вам — не наша дохлая вёска з непралазнай граззю. Ну, а што я там раблю і дзе жыву, дзе начую, — дык зноў жа: а каму якая да гэтага справа?

Аўтобуса «Мінск — Лагойск» тады яшчэ не было, і дабіраліся мы да райцэнтра ў кузавах грузавікоў, а далей — да Гайны, да Слабады, да Айнаравіч — пяшком. Усіх сваіх спадарожнікаў я добра ведаю яшчэ ад ранніх дзіцячых ці ад школьных гадоў, таму, натуральна, тэпаючы ад Лагойска дадому, мы пачыналі гаманіць, абменьвацца навінамі, аповедамі пра жыццё-быццё маладое. І ўпершыню я тады заўважыў: усе яны стараюцца, бедалагі, гаварыць па-руску, па-гарадскому, хоць слухаць гэта было няўсцерп цяжка. Адукацыі ў іх было тры, пяць, у лепшым выпадку — сем класаў. На будоўлі і на іншых чарнавых, падсобных работах у Мінску «моўнай культуры» яны набіраліся хутка. Стараліся ж! Бо як жа? Гараджане — і, гэта самае, гаварыць не ўмеюць як трэба. Я да іх звяртаўся або адказваў ім толькі па-беларуску і адчуў, што іх гэта трохі здзіўляе і нават раздражняе, — ім не зразумела: навошта я так? Аднойчы з намі, маладымі, ішла і ўжо сталых гадоў жанчына, ішла доўгі час моўчкі, чуючы, канечне ж, усю нашу гаворку. І нарэшце, павярнуўшыся да мяне, спытала:

— Чаму гэта ты, хлапец, па-дзеравенску гаворыш? Усе па-гарадскому, а ты — па-дзеравенску…

— Не ўмею іначай, — адказаў я жанчыне — так, як, здаралася, адказваў на падобнае пытанне і раней.

— А ты жывеш у Мінску?

— У Мінску.

— А даўно?

— Ужо скора два гады будзе.

— І дасюль не навучыўся гаварыць па-гарадскому?

— Ну вось такі недарэка, не навучыўся, як бачыце.

Жанчына з хвіліну памаўчала.

— Не, ты тут, хлапец, нешта хітруеш. А дзе ты што ў Мінску робіш?

— Я вучуся…

— Вучышся? А на каго?

— На настаўніка…

Жанчына неяк трошкі сцепанулася і пільна ўставілася мне ў твар.

— А-а-а, дык ты на настаўніка, — не тоячы расчаравання, прагаварыла, расцягваючы словы, спадарожніца.

Паставіць на гэтым у нашай перамоўцы кропку ёй як бы нешта перашкодзіла, як бы захацелася падкрэсліць сваю кемнасць і тым самым хоць трохі ўзвысіцца. І яна, з пачуццём самапавагі, падвяла рысу:

— Ну, дык жа я і сказала, што ты тут, хлапец, нешта хітруеш!

Дапытвацца, дзе я схітраваў, сэнсу я ўжо не бачыў. Зрэшты, можа, гэта сапраўды мая вялікая хітрасць — гаварыць на мове зямлі, на якой нарадзіўся?..

## «Эстэт»

Інтэрнат педвучылішча, я ўжо пра гэта гаварыў, знаходзіўся ў тым жа корпусе, дзе і вучэбныя класы. Вядома ж, не на адным і тым паверсе: класы — на другім, інтэрнацкія пакоі — на першым (для хлопцаў) і на трэцім (для дзяўчат). На першым жа была і кіназала, дзе мы глядзелі, здаецца, раз у тыдзень, кіно (за грошы, вядома) і якая, пры неабходнасці, служыла клубам, дзе праходзілі агульныя сходы навучэнцаў, сустрэчы з запрошанымі гасцямі (пісьменнікамі, напрыклад), канцэрты нашай самадзейнасці, а пасля такіх культмерапрыемстваў часам даваўся нам дазвол і на «танцулькі».

У верасні 1950-га, на пачатку новага навучальнага года, ад дырэктара выйшла распараджэнне: у абавязковым парадку навучэнцы кожную раніцу павінны займацца фіззарадкай — каб не прыходзілі вялыя і сонныя на першы ўрок. Ну і наогул для ўмацавання здароўя і падтрымання жыццёвага тонусу. Што да хлопцаў — тут праблемы не ўзнікала, мы і самі, без загаду зверху, стараліся і паразмінацца-паразгінацца, і абдаць твар — грудзі — рукі халоднай вадой у мыцельніку. А вось дзяўчатам, асабліва з малодшых курсаў, уласнай сілы волі на гэта не хапала. «Ім, — сказала начальства, — трэба памагчы, трэба праводзіць з імі фіззарадку арганізавана». Хто будзе праводзіць? Ну не выкладчыкі ж і не запрошаныя фізкультінструктары! Мы, хлопцы-старшакласнікі, павінны заняцца гэтай справай. Лічыць гэта сваім абавязкам, так бы мовіць, камсамольскім даручэннем.

У ліку тых, каму прапанавалі ўзяць на сябе гэты гонар, аказаўся і я. Шчыра кажучы, у мяне не было жадання траціць штораніцы час на такую «халтурку», — зусім не было! І я змог бы адбіцца ад прапановы, калі б… калі б не адно АЛЕ… Але ў тым і штука, што было адно АЛЕ. Была адна першакурсніčка, якую я паспеў што называецца запрыкмеціць у грамадцы яе сяброўак на вечарынцы. Дый як было не запрыкмеціць! Высочанькая, танкляве̄нькая, з прадаўгаватым, крыху смуглым тварыкам, невялікім кірпатым носікам і — гэта галоўнае — вельмі прыгожымі вачыма: цёмнымі, глыбокімі і (менавіта тады я зразумеў, як гэта называецца) — з паволокай.

Вядома ж, я выбраў сабе для прыкладання фізкультурніцкіх здольнасцяў пакой, у якім жыла гэта прыгажуня. У пакоі — дванаццаць дзяўчатак. Яшчэ з вечара я заглянуў да іх і сказаў — строгім, ну зусім начальніцкім тонам:

— Заўтра а восьмай я прыйду праводзіць з вамі фіззарадку.

— А мы ўжо ведаем, нам камендант сказаў, — хорам адказалі дзяўчаткі.

— Вось і добра. Як толькі празвініць званок — вы ўсе павінны стаяць на калідоры насупраць свайго пакоя. І каб без ніякіх спазненняў.

Я гаварыў гэта ўсім, а глядзеў амаль увесь час на адну. О, так, сапраўдная прыгажуня! Як добра, што дырэктар прыдумаў гэту фіззарадку! Выдатна: я ж кожную раніцу буду бачыць яе, неўпрыкмет любавацца, буду мець зусім натуральную (без падазрэння!) магчымасць загаварыць з ёю, напрыклад, зрабіць крытычную заўвагу, што практыкаванне яна выконвае не зусім правільна… Божа, як я чакаў гэтай першай раніцы! І хваляваўся, прачнуўшыся, як, не раўнуючы, перад экзаменам.

Ніякай адмысловай апраткі для фізкультуры ў нас тады не было — за выняткам трох-чатырох чалавек гарадскіх усе навучэнцы былі з вёскі. У чым хадзілі на ўсе іншыя ўрокі — у тым і на занятку па фізкультуры. Так што і я заявіўся да сваіх «падапечных» у штодзённым — і рабочым і святочным — адзенні, нават пінжачка не пакінуў у пакоі, як іншыя хлопцы-«інструктары», — наўмысна, каб яна бачыла мяне ў поўнай форме. Бо можа ж я хацеў, каб і яна звярнула на мяне ўвагу, ну, і ацаніла, і таксама зацікавілася. Бо справа гэта, як вядома, такая: калі толькі з аднаго боку — дык гэта не надта добра, трэба, каб адразу пачалося з двух бакоў…

Роўна а восьмай, па званку (званок даваў на ўвесь корпус дзяжурны — кадр каменданта) я ўжо стаяў насупраць «яе» пакоя. Пачалі высыпаць на калідор, адна за адной, першакурснічкі. Выстройваюцца ў шэраг, перамаўляюцца, жартуюць.

— Ну, што — усе? — пытаю, хоць бачу, што не ўсе: няма яе, яе няма!

— Там адна Тася засталася, яна зараз выйдзе…

«Вось я ўжо і ведаю, як завуць», — мільганула ў маёй заклапочанай галаве.

— Яна ў нас такая санлюўка — не дабудзіцца! — падкінула беленькая худзенькая дзяўчынка з сярэдзіны шэрагу.

— Ну, пачакаем! — рэагую на гэта адчувальна незадаволеным тонам. — Пачнем, як будуць усе.

Праз паўхвіліны выйшла яна. Не спяшаючыся выйшла. І зусім-зусім разаспаная.

— Ой, і прыдумаў жа нехта гэтую зарадку! — сказала замест «добры дзень» ці «здраствуйце».

— Ідзі во сюды, стань між намі, — паклікала беленькая.

І яна стала якраз у самай сярэдзіне шэрагу. «Гэта добра, — заззначыў я сабе ў тое ж імгненне, — будзе стаяць перада мной, а не дзесь скраю, куды зіркаць мне было б не зусім ёмка. Інструктар павінен стаяць тут, дзе стаю — пасярэдзіне…»

— Выраўняліся! — даю першую каманду. — Выраўняліся! Так, добра, цяпер хадзьба на месцы: з левай нагі — на месцы, шагам марш!

І ўсе затупалі. І яна таксама. Хоць, праўда, секунду прамарудзіла і пачала не ў нагу з усімі. Ну, такой бяды. Для першага разу гэта даруецца.

— Цяпер рукі па камандзе «раз — два» падымаем угору, глыбока ўдыхаем паветра і па камандзе «тры — чатыры» апускаем і выдыхаем…

Не паспеў даць каманду, як яна — мая царэўна-прыгажуня… Што такое? А божа, як яна моцна пазяхнула, на ўсю сілу, на ўсю вышыню пакаці, як пры гэтым, я сказаў бы, непрыгожа скрывіўся твар, заплюшчыліся вочы, зморшчыўся нос і агаліліся верхнія зубы… Хоць бы даланёй прыкрыла, дык жа не! Як быццам перад ёй, за два крокі, не стаіць сам інструктар! Схамянуўся, што трэба ж гнаць зарадку далей, і каманду:

— Робячы глыбокі ўдых, рукі падымаем угору: «раз — два»…

І запнуўся. Што такое? Што гэта такое? Удыхаючы паветра і ўздымаючы рукі, яна зноў так моцна, так шырока-высока, так непрыгожа пазяхнула, што ўвесь яе чароўна мілы твар неяк пачварна перакасіўся, уся казачна-анёльская прыгажосць няйначай як падалася раптам углыб цёмнай паласці роту… Божа мой! Яна не чуе маю каманду: «тры — чатыры, рукі апускаем і пры гэтым выдыхаем!» Якое выдыханне, калі пад гэту каманду яна зноў зайшлася страшным пазяханнем! Яшчэ страшнейшым, чым у першы і другі раз, яшчэ больш брыдкім. Працягваю, амаль машынальна, дакаць каманду, ужо не зусім упэўнена і зладжана, а ў душы пачыне ўсё мацней прагаворваць і пацвельваць чорцік расчаравання: «Ну? І гэта — царэўна-прыгажуня? Гэтая пазяхайла? Што ты ўбачыў у ёй? Знайшоў царэўну!..»

Царэўна знікла. Знікла раптоўна і жаданне праводзіць у першакурсніц фіззарадку. Вечарам пачуў, як адзін з хлопцаў выказаў шкадаванне, што яму не дасталася грамадская нагрузка фізкультінструктара на трэцім, дзявочым, паверсе. І я ўзрадаваўся магчымасці так лёгка вызваліцца ад даручанага мне абавязку. Зноў ісці туды і зноў бачыць, як царэўна-прыгажуня пачне перад табою, у цябе на вачах, гэта самае… — не! Не і не!

Тады я яшчэ не ведаў, што пазяхаюць усе, колькі іх ёсць, царэўны на свеце.

ВЕРШЫ

# БЕЛАРУСЬ — МОЙ СВЯТЫ КАЎЧЭГ!

Эдуард АКУЛІН



## Ной

*Збігневу Гордзею*

*Сорак раз пасылаў сякеру*
*у сваты да сырых камлёў*
*і каўчэг будаваў свой з веры,*
*што ўратуе жыццё Любоў.*

*Давяраўся, як брату, зверу,*
*з птушкай раіўся, як з сястрой,*
*і каўчэг будаваў свой з веры*
*у Гасподняе слова Ной.*

*Моўчкі зносіў людскія кпіны:*
*— Дзе ты плаваць сабраўся, Ной?*
*І ў качэг запрашаў расліны,*
*як паломнікаў, на пастой.*

*Перамогшы ў вайне з Патопам,*
*здзейсніў Госпадаў запавет…*
*І — ужо не з нуля, а з Ноя*
*нарадзіўся нанова свет!*

## О, Вільня!

*«О, Літва…», нібы малітву, —*
*шапчу сабе ўсю дарогу…*
*Сягоння — спатканне з Вільняй,*
*а значыць — спатканне з Богам…*

*Праходжу пад Вострай Брамай*
*і чую, як цяжка б'ецца*
*у лёхах старога храма*
*тваё залатое сэрца.*

*Каб вызваліць нас ад здрады,*
*Максім тут прысніў Пагоню.*
*Сто год як лятуць атрады*
*насустрач Крывіцкай волі…*

*Тут кожны камень — быліна.*
*Тут кожны уздых — аб страце…*
*Тут сэрца сваё пакінуў*
*грэць сын у далонях маці…*

*А я тут душу пакінуў*
*у звонкай цішы вакзала…*
*«О, Вільня — мая магіла…» —*
*сказаць не паспеў Купала.*

## Вяртанне

*Л. Дранько-Майсюку і Ул. Някляеву*

*Па дарозе з Вільні на Менск,*
*наліваючы ў чаркі крупнік,*
*я ўявіў, як у вусны рэк,*
*нібы ў сурмы паэты трубяць.*

*Па дарозе з Вільні на Менск,*
*па шляху з варагаў у грэкі*
*адбіваўся жмудзінскі лес ,*
*нібы лёс у крывіцкіх рэках.*

*Па дарозе з Вільні дамоў*
*нас было такіх толькі трое,*
*тых, хто мёдам разбавіў кроў,*
*і здалася без бою Троя…*

*Па шляху, што аслеп ад слёз,*
*нас было такіх крыху болей,*
*хто журбу кантрабандай вёз*
*па аднятай у нас Пагоні.*

*Па дарозе з Вільні на Менск*
*мы апокрыф жыцця тварылі,*
*што святое паблізу спрэс,*
*як ад Бога любоў Марыі…*

*Па дарозе з Вільні дамоў*
*мы успомнілі Гедыміна,*
*і — у жылах шалёна кроў*
*закіпела і задыміла…*

*Не было на зямлі радней*
*за начнога таго хаўруса.*
*Мы пілі, і зялёны Змей*
*спакушаў нас у Беларусы!..*

## Бог і блог

*Калісь размаўлялі з Богам —*
*шукалі ў сабе душу,*
*а сёння гаворым з блогам,*
*вяршым інтэрнэт-імшу.*

*Ну што тут, маўляў, такога,*
*калі віртуальны Бог*
*у імя ўсяго святога*
*царкву памяняў на блог.*

*Цяпер у кватэры кожнай*
*кампутар заміж бажніц,*
*дзе Богу маліцца можна*
*ці блогу — да зараніц…*

*Не молімся — нішчым Слова,*
*паклаўшы далонь на мыш…*
*Хоць шэпча душа: «Game over»,*
*ды Бог не ідзе на крыж...*

## Няблізка

*Сярод нябёсаў*
*на пару з Богам,*
*як два п'янтосы,*
*мы п'ем трывогу.*

*Бо з Таганрога*
*да тога Мінска*
*і ў пары з Богам*
*ляцець няблізка.*

## Іранічнае

*Убіўшыся ў куст акацый,*
*адчуў сябе крыху Богам*
*і ў думках пачаў збірацца —*
*падперці крыжом Галгофу…*

*Ды ўспомніў, што куст акацый, —*
*далёка не Лёс цярновы.*
*Як мудра сказаў Гарацый:*
*«Паэзія — гандаль словам…»*

## Экспромт

*Вясна.*
*А ў полі сасна.*
*Сакавік на дварэ.*
*Ніхто не гарэ…*

*А ў полі сасна —*
*зеляней, чым вясна.*

*А калі вясну памяняць на сасну?*

*Сасна.*
*А ў полі вясна.*
*Сакавік на дварэ.*
*Ніхто не гарэ…*
*А ў полі вясна —*
*зеляней, чым сасна.*
*Дык ніхто ж не гарэ!*
*Азіміна прэ!*

## Дома

***Трэба дома бываць часцей…***
***Рыгор Барадулін***

*На самоце ў бацькоўскай хаце*
*усю ноч не магу заснуць,*
*то успомню, як ткала маці,*
*то бабуляў, што жыта жнуць…*

*То ў пацёмках масніца рыпне —*
*гэта бацька прыйшоў дамоў…*
*Між нямкоўцаў такі адзін быў,*
*браў гармонік — спявала кроў!*

*Бо казалі ж, што хлопец Грыцаў*
*на «інструманце» граць мастак...*
*У вайну той «інструмант» фрыцы*
*падарылі за проста так.*

*Бацька-бацька, чаму ж ты здрадзіў*
*усяму, што ад Бога меў,*
*і гармонік, і сына й маці*
*ашчаслівіць не захацеў…*

*У калысцы дзяцінства — хаце —*
*ой, як трэба бываць часцей…*
*Тут нябожчыкі бацька й маці*
*скрозь чакаюць душу з гасцей…*

## Было…

***Калісь глядзеў на сонца я…***
***Максім Багадановіч***

*Ты ўся сатканая з лілей,*
*ты ўся сатканая з туману.*
*Віно з вадой змяшаў Арфей,*
*а я віну змяшаў з падманам…*

*А я насмеліўся сказаць*
*і паўтараць, як псальм, бясконца:*
*— Гасподзь жанчын такіх стварацьь*
*павінны быў з праменняў сонца…*

*Бо ты і ёсць само святло,*
*што асляпляе і чаруе…*
*Хай нехта скажа мне: — Было…*
*Было. Аслеп. Гасподзь даруе.*

## Грэх

*Ніколі душа не стоміцца*
*вяртацца ў Эдэмскі сад.*
*Да гэткіх жанчын становяцца*
*паэты па рыфму ў рад...*

*Пад пільным паглядам Пушкіна,*
*адвёўшы дуэльны гнеў,*
*Вы словы цымбальна гушкалі —*
*пяшчотай Эдэм звінеў.*

*А грудзі — спакусы птушкі,*
*забыўшы пра ятаган,*
*такія калісь прыручваў*
*да стэпу татарскі хан...*

*Хоць з веснамі вусны позняцца*
*спаткацца у снах наспех…*
*А ўжо паўтарыцца просіцца*
*нанова біблейскі грэх.*

## Бесядзь і Сож

***Ахвярую Алесю Усеню***

*Закахаўся у Бесядзь Сож,*
*а прызнацца не мае сілы...*
*І праліўся біблейскі дождж*
*ад Грамыкаў і да Сваціліч...*

*І вясёлка ўзышла, як німб,*
*над евангельскім тым каханнем.*
*Сож каралямі срэбных рыб*
*Бесядзь вабіў, пяшчоціў хваляй…*

*Не прыслаўшы сватоў-плытоў,*
*цалаваў яе ў вусце так,*
*ні прагнуў з сырых камлёў*
*распаліць у душы пажар.*

*І спатоліўся, бо здалеў*
*выпіць шчасце яе да дна…*
*І ад часу таго, як спеў,*
*Бесядзь льецца ў прасцяг адна.*

## Дар

*Плуг —аратаму, каб араў…*
*А паэту Гаспод даў крылы,*
*каб над пожняй жыцця лятаў —*
*не баяўся дрыгвы-магілы.*

*Нож — Вараву, каб рабаваў…*
*А паэту — пяро жар-птушкі,*
*каб, як Лорка, ім напісаў:*
*— Мама, вышый мяне на падушцы…*

*Грошы — дурню, каб бедным стаў…*
*А паэту Гаспод даў Слова,*
*каб Галгофу жыцця спазнаў,*
*а сканаўшы, пачаў нанова.*

## Месяц

*Апускаю руку ў Бесядзь,*
*каб дастаць для цябе месяц…*

## Гуслі

*Вусны твае —*
*гуслі мае…*

## На Палессе — услед за песняй…

***Леаніду Дранько-Майсюку***

*Падмывае Гарынь-рака*
*мае сны, дзе начуе Песня…*
*Асядлаю вала-быка,*
*хай звязе мяне на Палессе.*

*Толькі там Беларусь жыве.*
*Як пачую: — Було нам ліхо…*
*Каня селіцца не ў траве,*
*а ў душы — і спявае ціха*

*Пра Гарынь, што плыты вядзе*
*па чумацкім шляху-юдолі.*
*Слёзка з вочка ў душу ўпадзе,*
*сэрца жалем маё спатоліць…*

*Не раскрыліць мне болей чуб*
*мама Люба ў дзвярах ля печы.*
*І Васіль не паваліць дуб —*
*татаў човен адплыў у вечнасць…*

*Як адплыў учарашні дзень,*
*за туманам шукаць Дуная…*
*На слязіне — святой вадзе —*
*каня моліцца — рай вяртае…*

*Бо не знойдзеш такіх нідзе*
*ні людзей, ні дубоў пахілых…*
*Цёмнай ноччу і ў ясны дзень*
*Беларусь — мой святы каўчэг —*
*ад калыскі і да магілы.*

## Над магілай Анатоля Сыса

*Не трэба над магілай прамаўляць, —*
*хай свечкі й кветкі моляцца у скрусе...*
*Тут спіць Паэт — ягo нам не падняць,*
*зайшло за хмары сонца Беларусі.*

* * *

*Мы жывем у міфічнай краіне,*
*што існуе ў нязбытным сне.*
*Беларусь жа сапраўдная гіне,*
*хоць ахрыпні ад крыку: «Жыве!».*

*Бо ніхто таго крыку не чуе.*
*Нават Бог — як Бетховен глухі…*
*Не жывем, а свой лёс жабруем,*
*як жабруюць душу грахі…*

▸ ФРАГМЕНТЫ

# З КНІГІ «ПАКУТНЫ ВЕК»

Васіль ЯКАВЕНКА



Фота Vialejka.org

## Яблычны спас

Ранішняя пакуль дрымотная цішыня. І вось-вось стане тое, чаго чакаюць, што наплывае паімгненна, гатовае абудзіць душу:

— Бо-о-оммм… Бо-о-оммм… Бо-о-оммм… Дзінь…

Чысты меладычны гук, мяккі і пругкі, прывольны… прадонны. Бо-о-омм!.. Разлягаецца ўдалеч. А ўслед бягуць урачыста-вясёлыя падгалоскі: дзінь-дзілінь-дзінь!.. Яны бытта ўлягаюць за тым, за галоўным звонам, бытта даганяюць яго…

Прастора ў царкве поўнілася пахам ладану, і, стоячы непадалёку ад алтара, Пятро Рамановіч слухаў хваласпеў святароў і назіраў за іх карагодам; на прастольнае свята сюды, да айца Георгія, іх збіралася цэлы тузін, калі не болей, з усіх прыходаў акругі. Пятро слухаў іх і цешыўся, як гучыць і пераліваецца шматгалосым, чыстым наплывам хор, як поўніць ён усю прастору да скляпення, і як, узмоцнены сценамі, абвяргаецца на яго і працінае наскрозь. На душы было хораша. Болей за тое, гаспадар Пятро ўзносіўся душою над усім гэтым, інакш кажучы, усё чутае, ведомае, існае прыўздымала ягоную душу, спалучала яе з жыццём продкаў і несла па рацэ часу далей і далей...

На цвінтары, калі выйшаў, яму сустрэўся сын Паўлюк, энергічны, узбуджаны святочным настроем вялікай грамады, у якой не кожны, мусіць, табе сват ці брат, але ж усе свае, і было з кім перакінуцца вострым слоўцам ці жартам.

Яны прайшлі далей ад высокіх дзвярэй, адорваючы жабракоў, якіх тут сабралася нямала. Паводле падання, пададзеныя жабраку грошы ў гэты святочны дзень пераходзілі нябожчыкам, і тыя спрыялі, каб дабро стакроць адплочвалася дабром таму, хто дае.

Спыніліся каля музыкі Піліпа, скрыпка якога цяпер на поўны голас спявала.

— Ты яго ведаеш, тата? — спытаўся Паўлюк.

— Чуў пра яго. Мы з ім нават сёння пагаманілі. Нармальны, здаецца.

— Дзіваком лічаць яго, а як іграе! Зайздросна… Памяшаўся розумам на каханні да вясковай дзяўчыны.

— Паўлюк, — Пятро дастаў з кішэні і сунуў у далонь сына жоўтую манету. — Вазьмі і занясі яму, пакладзі ў футляр…

## Мікалай-звон

Кірмаш гудзеў, ляскатаў, шапацеў чалавечымі галасамі, пераходзіў на прыглушаны гул, у які час ад часу ўпляталася фыркание і ржанне коней.

Шырокі пляц, як скінуць вокам, варушыўся і вёў гандаль. Каля фурманак з яблыкамі, ігрушамі, слівамі, як назолы мухі, круціліся падлеткі – каб сцібрыць што-якое вабнае, калі гаспадар зазяваецца…

Тавару ў гандлёвых радах — процьма, пачынаючы ад скарбу зямлі, вапны, здабытай у Бездзежы, гаршкоў, якімі славіліся ганчары Гараднай, ды розных бочак, бочачак, маслабоек, біклаг, кублоў для сала, змайстраваных слаўнымі бондарамі ў Рыловічах, канчаючы бочкамі мёду, што былі пастаўлены тут ажно ў шэсць радоў прадпрыймальнымі гаспадарамі навакольных вёсак і хутароў. Тут і алей на ўсе густы, свежая рыба, каўбасы, смятана, сыры, булкі, цукеркі… Прадавалі коней, кароў, парасят, авечыя шкуры і хром на боты. Рымар Абко меў прадаваць раменны вупраж. У вочы кідаліся тавары, прывезеныя здалёку: пушыстыя кусцікі кавылю, пафарбаваныя ў розныя колеры, кітайскія вабныя ліхтарыкі ды вееры. Каля іх тоўпіліся маладзіцы, дзяўчаты і дзеці. Купцы спрактыкавана зазывалі пакупнікоў.

Прайшоўшы ў куток, дзе кідаліся ў вока свежым адгабляваным дрэвам кадушкі, Пятро Рамановіч з цікавасцю агледзеў новую медагонку, пэўна, з кляновай клёпкі; яму яна спадабалася, але потым падумалася, што і старая ў яго яшчэ не знасілася, таму няма сэнсу даваць ёй адстаўку.

Каля радоў з мёдам ён заўважыў прыяцеля — купца Клямку. Той бойка абмяркоўваў штосьці з патлатым таўставатым, але яшчэ не старым чалавекам, выцягнуты авал твару ў якога і бычыныя вочы, якімі ён паволі варочаў, паказвалі на спаважнасць і мудрасць думкі.

— Віват, пане пчаляр! — усклікнуў Клямка, калі заўважыў паблізу Пятра. — Знаёмцеся: гэта купец з Хэлма…

І той падаў руку:

— Мэндаль.

— Але ж вас я, шаноўны гаспадар Пятро, — доўжыў Клямка, — гэтаму купцу не аддам! Нашая дамова з вамі застаецца ў сіле.

— Ну гэтак, — кіўнуў Пісарчук. — Таму я і не выстаўляю свой мёд на кірмаш.

— Добжа, — і да таго купца: — А ці ведаеш ты, пане Мэндаль, сенатара Рамана Скірмунта? Між іншым, ён у Парэччы жыве. Дзе і я… Раней ачольваў Таварыства па распрацоўцы сельска-гаспадарча-эканамічных патрэбаў Палесся.

— Я меў чуць пра Скірмунта. Толькі ж польскія паны-абшарнікі пра яго дрэнныя словы казалі.

— Дарэмна! Ведай адно: пан Скірмунт і гаспадар Пятро Рамановіч – беларусы, якіх я найболып паважаю.

— Прыемна чуць! — і Мэндаль яшчэ раз мякка паціснуў руку Пятра.

— А мы тут з панам Мэндалем спрачаемся пра акцызы, — патлумачыў купец Клямка.

— То вы й працягвайце. Гэта ж ваш дзень сёння! Бачыце, што робіцца: тавараў — безліч. Прайду далей і я — пагляджу яшчэ тое-сёе.

Пятляючы між радамі, Пятро прабіўся на другі бок плошчы. Сярод знаёмых ён неўзабаве стрэў Малыцкку — чалавек прыдбаў крэйды для пабелкі сцен у пакоях падрамантаванай хаты. Паблукалі разам і купілі для сваіх маладзіц цукерак, а Пятро яшчэ і тульскіх пернікаў для ўнучкі. Нарэшце ён спыніўся каля воза з п'янькоўвымі вяроўкамі, узяў адну з іх, каторая таўсцейшая, у роздуме пакруціў, пацёр у пальцах, як знаток натуральнага сялянскага валакна, прыцаніўся, дастаў з кішэні і аддаў грошы. Добрая вяроўка! Нехай будзе на ўсялякую патрэбу.

Калі вярнуўся ў сядзібу, сын Барыс і астатнія ўжо былі дома. Селі сям'ёю за стол. Самы час! У царкве ж недзе ўсё яшчэ служылі святочную службу, пасля якой зморапыя святары збяруцца ў вялікай хаце каля царквы і за накрытым святочным сталом таксама спазнаюць хмельную радасць і асалоду быцця.

На стале ў Пісарчукоў пераважаюць стравы з рыбы, грыбоў, садавіны ды гародніны. Піражкі з яблыкамі, піражкі з тварагам… Мёд… Спас, як заззвычай, прыпадае на Засненскі пост, ведомы яшчэ як пост Успення. Пастом і вызначаецца акраса стала. Пад першыя нягучныя сямейныя тосты прапусцілі па чарцы, потым яшчэ, але ўсё без лішку, вольна, прыстойна.

Толькі вось гаспадара Пятра і тут не пакідала засяроджанасць:

— Я ўсё думаю: калі-небудзь знойдзецца тэхніка і знойдуцца людзі, якія дапамогуць нам вызначыць, дзе ляжыць ён, адкапаць і выцягнуць з вады Мікалай-звон.

— Пятро! — усклікнула Аксіння і доўжыла, увачавідкі пакепліваючы: — Без таго звону ты проста жыць не можаш!

— Мама! Ці чуеш, мама!.. Трэба паважаць таткаву схільнасць да музыкі!

Апошнія словы выгукнуў сын Паўлюк. Не ўсе зразумелі, што ў яго галаве?.. І Паўлюк даводзіў:

— Вось Піліпу, да прыкладу, падабаецца скрыпка, некаму хораша кладзецца на душу арган, а тату — медны звон! Таму ён і марыць пра дужага Мікалая! Той малінавы звон заўсёды будзе гучаць у ягоных вушах. Я праўду кажу, тата?

У застоллі зрабілася весела, і за бацьку заступіўся Барыс:

— Я не веру ў Бога, і вы гэта ведаеце. Тым не менш, скажу: асілак-звон здольны быў адганяць чарцей ад Моталя на дваццаць вёрст! Штука дужа прыемная і карысная! Апроч таго, Мікалай-звон быў і, калі яго выцягнуць, зноў можа стаць адметнасцю, сімвалам мястэчка.

— Хіба што…

— Тады, — узняў чарку Паўлюк, — за яго вяртанне!

— Анягож, — не змоўчала Зося і кінула мужу: — Ідзі, раней выцягні, а тады ўжо!..

— Выцягну!

І тут усе на момант прыціхлі.

— Да пшанічанька яра-а-а, — у распеў пачала Зося…

Застолле адчула смак і асалоду ад таго журліва-лірычнага напеву.

Не ў першы раз у гэтай сям'і гучыць Зосін голас, а дзівіць і ўражвае сваёй чысцінёй, тэмбрам, роўнымі, вытрыманымі і адначасова своеасаблівымі меладычнымі пераліваімі. Да яе адразу ж далучыліся іншыя галасы: Ганны, Аксінні, Паўлюка дый Пятра. Песня набрала моцы і нікольні не страчвала свайго задушэўнага ладу.

Яравы аве-ес,<br>
Не по праўды, козачэ,<br>
Не по праўды, соколю,<br>
Ты со мною жывеш,<br>
Зо мною жывеш…

Маня-малеча акурат у той момант была каля стала, яна заціхла і глядзела на сваю дружную радню, пераводзіла позірк з аднаго на другога ды з захапленнем слухала. Пры спяванні апошніх слоў куплета маладзіцы, аднак, пачалі ўкрадне зыркаць на яе татку і пераміргвацца. А гэтага для яго ўжо было занадта! Бацька няйначай знайшоў нейкую нагоду, устаў і выйшаў з хаты. Дармо, у спіну яму ляцела:

Зо мною жывеш…<br>
Дай як прыйдэ ве-ечур<br>
Да вечур-вечурочак,<br>
Да другоей ідэш.

Вярнуўся Барыс неўзабаве, ды не адзін, а са сватамі: Параскай і яе сынам Паўлам Міховічам, братам Ганны і Зосі; Павел хадзіў яшчэ ў жаніхах; за імі ступіў на парог і сват Іван Баяба, добра зleплены, мажны, відны, з жонкай Мар'яй — сястрой Ганны і Зосі, — яна ж побач са сваім чалавекам Іванам выглядала дзяўчынкай.

Насустрач ім з застолля абрынулася раскацістае, вясёлае:

Сёння ў нашай хаце свята,<br>
І гасцей як тут багата!<br>
Ўсіх на свята запрашаем<br>
І сардэчна вас вітаем!

Паўлюк, а за ім і яшчэ той-сёй, прытанцоўваючы, падхапіліся вітаць дарагіх сватоў.

Дзень быў доўгім, гаманкім і песенным, але ж і яму прыйшоў канец.

Звечарэла. У хатах ужо тамсям запальваліся лямпы, і старыя пасля таго, як дагледзелі жывёлу (якая не зважала на хмельны рэй у сядзібе), паціху супакойваліся ды рыхтаваліся да сну. Іншы план быў у моладзі: яна заўзята шыкавала на зборнях, наладжвала танцы альбо ўлагоджвала свае ўзаемаадносіны па цёмных кутах — каханне ж было за асноўны матыў у будове жыцця.

Акурат у гэты час Пятро з Аксінняй выйшлі з сядзібы за веснічкі.

Пад самымі вокнамі іх мураванкі была ўкапаная невысокая лаўка, і менавіта каля яе гаспадары раніцай паставілі стол, накрылі яго белым абрусам, на ім пакінулі ў плеценай вазе яблыкі ды графін з мядовым напоем, кружку…

Гэта быў добры знак і звычайнае таму, хто гуляў на вуліцы — пачастунак для ўсялякага ахвочага. Так рабілі і іншыя гаспадары.

Пятро ды Аксіння выйшлі, каб забраць святочны стол у двор. Толькі ж Пятра пацягнула прысесці на лаўку — пасядзець, крыху ачомаца ад дзённага тлуму. І, паклаўшы на пакацістыя і цёплыя плечы жонкі руку, ён прыгарнуў яе да сябе.

— Вось так і жывем, — мовіў ён. — Усё, што трэба для жыцця, здабываем. Нялёгка… цяжка бывае, але ж, калі на тое, і весяліцца ўмеем.

Уздыхнуўшы, ён хвіліну памаўчаў.

— І добра, — казаў далей, — адно на душы неспакойна.

— Ты пра Барыса?..

— Ды не! Я ўвогуле… З газет відаць: свет наўкола неўладкаваны. Людзі грызуцца альбо рыхтуюць доўбні адзін на аднаго. У Іспаніі вайна… У Нямеччыне да ўлады прыйшлі нядобрыя людзі і, пэўна, вялікія рызыканты. Нешта новае ўваходзіць у жыццё. Адразу й не ўцяміш. Калі б на нашай вуліцы, напрыклад, знайшоўся паскуднік, які дбаў толькі пра ўласную сядзібу і на суседскія селішчы глядзеў, як на сваё, без усялякіх выбачэнняў таптаўся па чужых агародах… Што б ты, Ксеня, пра такога сказала?

— Не ведаю, гэта ж няможна ўявіць сабе!

— І я не ўяўляю. Зрэшты, немцу прыклад падавала й Польшча. Вазьмі панскую ўвагу да беларускага люду, агонь яе выкуры! У Крэсах Усходніх знікаюць апошнія беларускія школы. Нас пазбаўляюць супольных чалавечых правоў. А там, далей, пачалася ўжо тузаніна з жыдамі, іх прымушаюць высяляцца з Нямеччыны.

— Як гэта? Зусім?..

— А што ты думаеш!.. Польшча, між іншым, заключыла з немцамі дамову тэрмінам на дзесяць гадоў аб мірным суіснаванні, павазе да нацыянальных межаў… Але ж немцы зноў узбройваюцца і бачаць непазбежнай сваю вайну з бальшавіцкай Расеяй. Адсюль, як бачыш, вынікае: Польшча можа апынуцца ў адным хаўрусе з немцамі, і тады… прыгадайма вайну!

— Не давядзі Госпадзі!

— І тая навала нас не абміне. Але ж лепш не думаць пра гэта…

У небе ўсё ярчэй разгараліся зоркі. З возера разам з туманам ішла прахалода. Чуліся загадкавыя воклічы і смех, недзе воддаль пілікаў гармонік. Неўзабаве ўзнікла песня і сціхла… Зноў заспявалі ў некалькі галасоў.

Да пшанічанька яра-а-а…

— Чуеш? — сказала Аксіння. — Напэўна ж, і наша нявестачка ў тым карагодзе.

— Няхай. Але ж як гучыць над возерам дзявочы напеў, пад высокім азораным небам!

Мелодыя па-новаму чаравала. Яна вяртала Пятра і Аксінню ў сваю маладосць, не такую ўжо і далёкую, а толькі — як помняць сябе яны — сумесную, суладную; і прайшла іх маладосць праз выпрабаванні аж да гэтага дня, да гэтага самага Спаса-Ратавальніка, — ім заўсёды здавалася, што не будзе ёй скону…

**Другое дапоўненае выданне кнігі Васіля Якавенкі «Пакутны век» можна набыць, папярэдне замовіўшы яе па тэлефонах: (МТС) 776-77-13; (Velcom) 304-40-64.**

АДКАЗЫ

# ЗЬНІЧ

***Што для вас свабода?***
*Хто не ў Хрысьце — абмежаваны,*
*Нібы ў малым чаравіку,*
*Альбо — як вершнік зацугляны,*
*Ці у кайданы хто закуў.*
*Нехрысціянскія «мадэлі»*
*Светабудовы й грэшных нас,*
*Нібы дзіцячыя арэлі,*
*Што гойдаюць з бясчасся ў час.*
*Хто зведаў існую Свабоду,*
*Што даў нам Бога-Чалавек, —*
*Вяртае Богу з веку ў век*
*Даўгі Адамавага роду…*

***Што найбольш абмяжоўвае вашу свабоду?***
*Грэх.*
*Як Еву Змій абмежаваў*
*А следам і Адама сціснуў,*
*Грэх, як атрута, ўсё працяў,*
*Зачараваў, зрабіў няісным.*
*Святыя Божыя дары —*
*Сусвет, свабоду, наваколле —*
*Ператварыў у бляск зары,*
*Недасягалнае ніколі…*

***Чаго вы найбольш баіцеся?***
*З духам ліхім сябе звязаць*
*У плынным і у вечным лёсе,*
*Ў спакусах страціць Благадаць,*
*Што даў Гасподзь мне ў святым хросце.*

***Кім з сучаснікаў вы захапляецеся?***
*Хто з верай дбае пра жыццё*
*І Богу дзякуе за ўсё…*

***Што вы найбольш любіце рабіць?***
*Ураз: маліцца… і раяліць,*
*І (трэцім голасам) — рыфмарыць…*

***Калі б можна было пражыць жыццё яшчэ раз, што б вы змянілі?***
*Каб зноў жыццё змагло пачацца,*
*Раней пачаў бы ўцаркаўляцца…*

***Якую найлепшую параду вы атрымалі?***
*Якая — на усе вякі — парада?*
*Ўхіляйся ў сэрцы Кайнавай вайны,*
*Агню пякельнага —*
*прад бліжнім здрады,*
*Прад Богам — нераскаянае віны.*

***У якой палітычнай сістэме і ў якой краіне вы хацелі б жыць?***
*Я жыць хачу там, дзе законы дзяржавы*
*Адпавядаюць Канонам Царквы,*
*Дзе людзі жывуць дзеля Божае Славы —*
*Ад Вашынгтона аж да Масквы.*
*А дзеля назвы тае краіны*
*Я ў Бога літасці папрасіў:*
*Дай, Божа, жыць Твайму блуднаму сыну*



*У Трыадзінай Святой Русі…*

***У якую эпоху вы хацелі б жыць?***
*Мая эпоха заўжды са мною:*
*З Царства Нябёснага —*
*ў царства зямное…*
*Потым — назад,*
*да Крыніцы Натхнення,*
*У Богадайны рай летуценняў…*

***Якія адносіны Беларусь павінна мець з Эўразвязам і з Расіяй?***
*Як і ў час Канстанціна Вялікага,*
*Сёння зноў Эўропа — хрысцьянская:*
*Праваслаўная, каталіцкая,*
*А на поўначы — пратэстанцкая.*
*Беларусь — яе Сэрца… А ў Цэласці —*
*Ўсё сумовіцца з Божае Ласкі,*
*Усе Крэсы хрысцьянскія — наскія!*
*Толькі б веры хапіла і смеласці.*

***Калі і як у Беларусі зменіцца ўлада?***
*«Калі зменіцца татуля?» —*
*Прашаптаў у сне сынок*
*І матулечку расчуліў:*
*«Спі, дзіцятка, — як дасць Бог».*

***Калі беларусы загавораць па-беларуску?***
*На Боганатхнёнай Мове*
*Мы сумовімся з Хрыстом*
*Шмат вякоў… І ў Бозе-Слове*
*Наш жыве Царкоўны Дом.*
*Ну, а свецкія гаворкі*
*І паноў, і мужыкоў*
*Трэ а б о ж ы ц ь доляй горкай…*
*……………………………………*
*Хто пакаяцца гатоў?*

***Што будзе, калі беларусы не загавораць па-беларуску?***
*Мо, я злёгку глухаваты,*
*Але сведчыць Дух Святы:*
*Я не чуў ад майго брата —*
*Беларуса — нематы…*

**(Тэксты ўпершыню прагучалі на хвалях Радыё Свабода–)**

ПАРЦЭЛЫ

# АЛЕСЬ МАКРАЦОЎ



***

*Высокаму*
*духам*
*бачна*
*будучыня…*

***

*Апісаўшы*
*крывую жыцця —*
*бумерангам*
*дамоў*
*вярнуся…*

***

*У пастарэлай*
*хаце —*
*бездапаможная*
*маці…*

***

*Будучае*
*малога…*
*Мінулае*
*пажылога.*

***

*Маці…*
*Азяблай*
*вяргіняй*
*вяне…*

***

*Будучыня*
*нябыту…*
*Вечнасць*
*мінулага…*

***

*Між дрэў —*
*людзі з нажамі…*
*Дажджлівы,*
*грыбны жнівень.*

***

*Выпрастаная*
*рака…*
*Пакрыўленая*
*прырода.*

***

*На дрэвах*
*людскіх лёсаў*
*пладамі*
*спеюць учынкі…*

***

*Вызваленне*
*нацыянальнай мовы*
*з-пад слоя чужой…*
*Рэстаўрацыя*
*беларускага Храма…*

***

*Пярэстай*
*сарокай*
*зіма*
*праляцела…*

***

*Нязносны*
*для голага лесу*
*мароз…*
*Страляюцца дрэвы.*

***

*Залацістае зерне*
*новага ўраджаю*
*на асфальце*
*дарогі…*
*Падатак,*
*спагнаны ветрам…*

***

*Шэрань*
*вершаваных радкоў —*
*паэзія*
*зімовага дроту…*

АДНАРАДКОЎІ

# ЯЗЭП ПАЛУБЯТКА

## Судны дзень

Ісус маўчаў, а Саваоф не слухаў.

***

Іду жыццёвым шляхам да Галгофы.

***

Нас толькі смерць уратуе ад жыцця.

***

Які вялізны ложак без цябе.

***

Любая! Сёння я зноў заработак прапіў!

***

Партыі веру, як жонцы сваёй.

***

Хачу на пенсію хутчэй.

***

А хто наступны будзе правіць баль?

***

Засыпае Чарнобыльскі попел сляды.

***

І зноў іду я на паклон да бюракрата.

***

Прыязнасці тваёй не бачыць мне ў труне.



***

Крывыя ногі выстаўляеш на паказ.

***

Сусвет пакрыты брудам чалавечых перамог.

***

Яго псавалі разважанні.

***

Воляю голад не натоліш.

***

Не кіпі! Будзь такою гарачаю ноччу!.

***

Такія вусны! І такі язык.

***

Са шляху светлага хачу звярнуць налева.

***

Чужыя хібы цешаць чалавека.

***

Аб «сціпласці» тваёй гаворыць увесь свет.

***

Сваю Галгофу насыпаю сам.

***

Мне так адзінока ў натоўпе людскім.

***

Шушкевіч зноў казаў пра талерантнасць.

***

А я хачу цябе яшчэ і днём.

***

Не кожная птушка лётае ў небе.

***

Ты болей мне не сніўся па начах.

***

Не губляй сябе ніколі.

УВАГА: КОНКУРС!

## Паважаныя сябры!

З 1 студзеня 2010 года Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае новы конкурс на лепшы літаратурны твор, у якім асвятляецца вобраз жанчыны ў сучасным грамадстве і асэнсоўваюцца актуальныя гендэрныя праблемы.

На конкурс прымаюцца тэксты ўсемагчымых жанраў: паэзія, проза, драматургія, крытыка. Аўтарамі конкурсных твораў могуць быць і мужчыны, і жанчыны, і пачаткоўцы, і прафесіяналы.

Лаўрэатаў літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве», які будзе доўжыцца да 1 кастрычніка 2010 года, чакаюць прэміі, прызы і падарункі, а пераможца атрымае магчымасць выдаць свой тэкст асобнай кнігай!

Калі ласка, дасылайце свае творы на адрасы: паштовы — 220025, Мінск-25, а/с 91; электронны — sbp@tut.by.

**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by